Алесь Аркуш

# АСКЕПКІ ВЯЛІКАГА МАЛЮНКУ

KAMUNIKAT.org

Логвінаў
Менск
2007

# Зьмест

**Маё Жодзіна**
**Гэсэ, вярблюды і войска**
**Вяртаньне ў "Тутэйшыя"**
**Аскепкі вялікага малюнку**
**Полацак жывы літаратурай**
**Рызыкоўная барацьба намэнклятуры**
**Друкарскія таямніцы**
**Варона**
**Крыж Эўфрасіньні Полацкай**
**Дзе пахаваны наш першы сьвяты**
**Паўгоду ў скуры віленчука**

## Маё Жодзіна

ПЕРШЫ САМВЫДАЎ

Свой першы самвыдаў я зрабіў у Жодзіне. На дварэ стаяў 1983 год.
Вярнуўшыся з войска, я падаўся ў наргас. Як большасьць студэнтаў-жодзінцаў, езьдзіў на заняткі электрычкай. На першым курсе БДІНГ набыў просьценькую, самую танную друкарку «Москва» і вечарамі «перастукваў» сваю паэзію (на той час друкарку можна было мець ужо без рэгістрацыі ў органах). На пачатку 1980-х я належаў да кола маладых паэтаў, якія гуртаваліся вакол часопісу «Рабочая смена» (неўзабаве ён стаў «Парусом», а затым і зусім зьнік). Алеся Аркуша яшчэ не было, а Аляксандар Козік пісаў па-расейску. Сярод іншых «рабочасьменаўцаў» наперш згадваецца Вера Лойка, цяперашняя жонка вядомага паэта Леаніда Галубовіча. Яна, дарэчы, і дала мне адрас «вельмі таленавітага» хлопца зь вёскі Вароніна, зь якім я меў надзвычай інтэнсіўнае ліставаньне. Было гэта, праўда, пазьней – у 1986 годзе. Сама ж Вера пазнаёмілася зь «беларускім Рубцовым» толькі праз год у Маскве ў літінстытуце – у Белакаменнай яны й пабраліся шлюбам. У 1986-м у паветры ўжо лунаў дух

«вызваленьня». У 1983-м сытуацыя была іншая.

Мая першая публікацыя ў «Рабочей смене» рыхтавалася вельмі марудна. Зьявілася яна ў верасьнёўскім нумары за 1983 год. Пісаў я пераважна вэрлібры пад уплывам менскага расейскамоўнага паэта Валер’я Ліпневіча. Стаміўшыся чакаць «вялікага» дэбюту (дагэтуль мяне друкавалі толькі шматтыражкі БелАЗу «Белорусский автозаводец» і наргасу «Экономист»), я вырашыў самастойна «выдаць» свой першы зборнік паэзіі. Называўся ён «Дыхания». Наклад рабіўся на друкарцы з дапамогай капіркі. Збрашуравала саматужныя зборнічкі знаёмая маёй маці ў белазаўскай друкарні. Вядома, таемна.

Сёньня той зборнік чытаю з усьмешкай, хаця вытокі паэзіі Алеся Аркуша ў ім добра прасочваюцца. Падставы для тае амбіцыі былі слабаваценькія, але набыты «скарынаўскі» досьвед ня зьнік бясьсьледна. Напрыканцы 1980-х у Наваполацку амаль у такі ж спосаб я пачаў выдаваць літаратурны альманах «Ксэракс Беларускі».

## ПОШУК ВЫТОКАЎ

У 1993 годзе мне закарцела адшукаць свае жодзінскія вытокі. Я напісаў эсэ «Мой нязьдзейсьнены Ёкнапатофа». Тэкст гэты, праявіўшы нечуваную талеранцыю, надрукаваў орган Жодзінскага гарадзкога Савету народных дэпутатаў «Жодзінскія навіны». Сёньня наўрад ці нешта падобнае магло б зьявіцца на старонках тае газэты. Варта прывесьці невялікі твор цалкам:

Калі час ад часу я наяжджаю ў Жодынь (так называла горад майго дзяцінства мая родная бабуля, якая амаль усё жыцьцё пражыла ў вёсцы Арлова, што за дванаццаць кілямэтраў ад сёньняшняй белазаўскай агароджы), я кожны раз па-іншаму згадваю свае дзіцячыя і юначыя гады. Праўда, у маіх успамінах заўсёды адсутнічаюць шчымлівыя настальгічныя ноткі.

Я не ідэалізую свайго дзяцінства. Хапала ў ім рознага, пэўна, як у дзяцінстве любога чалавека. Аднак чагосьці прыкметна-ўрбаністычнага ў ім не было ані каліва. Мае бацькі жылі і жывуць цяпер у самай старой і даволі аддаленай ад цэнтру гораду частцы Жодыня, як яе называюць жодынцы, – пасёлку ДРЭС. Мусіць, калі б я стаў празаікам, я абавязкова напісаў бы кнігу пра жыцьцё гэтай населенай кропкі. Штосьці

сярэдняе паміж гумарам Шукшына і сур'ёзнасьцю Фолкнэра (памятаеце ягоны ўяўны гарадок Ёкнапатофа?). Калярытных герояў на ДРЭСе знайшлося б на добры тузін аповесьцяў... Аднак я стаў паэтам. Чаму? На гэтае пытаньне не адкажа ніхто. На ўсё воля божая. Але нейкія пазасьвядомыя вытокі майго паэтычнага нараджэньня можна прасачыць.

Напрыканцы 1980-х у беларускую літаратуру нарэшце прыйшлі выхаванцы гораду. Яны ўпарта падкрэсьлівалі сваю «гарадзковасьць». У паэзіі і прозе пачаў прабівацца кволы парастак беларускай урбаністычнай літаратуры. Зьявіліся вершы пра тэлевежу, мікрараёны, бітум, гарадзкую вуліцу. Гэта не было «бурапенства» будаўнікоў сьветлага заўтра, як некалі ў «маладнякоўцаў» 1920-х гадоў. Гарадчукі 1980-х спрабавалі выштукаваць сваю адмысловую эстэтыку, эстэтыку асфальту й бэтону. Яны шукалі прыгажосьць на тлумных гарадзкіх вуліцах. Яны разумелі, што горад – іх наканаванасьць, ад яго нікуды ня дзецца. Таму трэба творча «ператраўляць» яго, прыстасаваць для паўнакроўнага жыцьця. Літаратары, гараджане другога-трэцяга пакаленьня, пачалі ствараць сваю плынь. І хаця па ўсіх біяграфічных анкетах паэт Алесь Аркуш

лічыўся «прадуктам гораду», аднак літаратурныя крытыкі ніколі яго не далучалі да «ўрбаністаў». Ну які гэта ўрбанізм?

Над балотам захад сонца.
Пасярод, нібыта рана,
Багны дрогкае акенца
Чырванее. За парканам
З трысьнягу, аеру, хлуду
Цішыня – як погляд Бога,
Быццам там чакаюць цудаў
Ці даўно няма нікога.

Гэтак сама Аркуша нельга занесьці ў вясковыя «традыцыяналісты». Няма ў яго вершаў пра касцоў, аратых, росныя раніцы. Ягоныя вершы задужа ідэалістычныя.

Сапраўды, маё дзяцінства нельга назваць ані вясковым, ані гарадзкім. Самота ціхага пасёлку прызвычаіла мяне да кнігі, да ідэалістычнага сузіраньня, да адзіноты. Любімым месцам баўленьня часу была навакольная прырода – рэчка Пліса, возера Судабаль, лясы ў ваколіцы Зялёнага бору (нездарма пазьней блізу тых лясоў пабудавалі сваё лецішча мае бацькі). Менавіта там я адчуваў душэўную разьняволенасьць, знаходзіў паразуменьне з навакольным сьветам. Мусіць, у тыя хвіліны душэўнага

разьняволеньня і нарадзіўся паэт Алесь Аркуш. Але далейшы мой лёс не дае падставаў для падобнага меркаваньня.

Так было ў дзяцінстве, калі я мог не зьвяртаць увагі на горад Жодынь, ігнараваць яго прысутнасьць. Дарослым юнаком абстрагавацца ад яго існаваньня было немагчыма. Родны горад быў задужа рацыяналістычным, як мэліярацыйная канава, у яго не было культурных традыцый. Час сузіраньня скончыўся, прыйшла пара дзеяць, зьдзяйсьняць задуманае, жыць так, як я лічыў найбольш патрэбным, а ня так, як прымушала плынь жыцьцёвых падзеяў. І таму Жодынь проста выпхнуў за свае межы паэта Алеся Аркуша (дарэчы, мой літаратурны псэўданім зьявіўся, напэўна, дзеля таго, каб схавацца ад сумнай будзёншчыны, пазбавіць уяўнага паэта Аркуша ад непажаданых сутыкненьняў з жорсткай таталітарнай навакольнай рэчаіснасьцю).

Козік даў Аркушу шанец на нонканфармізм. Ён пазбавіў апошняга ад усяго руціннага і бруднага. Праўда, Аркуш ня быў сьляпым, і таму ў яго паэзіі столькі надрыву і расчараваньняў.

Аркушу ня трэба было прыстасоўвацца да хцівага жыцьця. Яму ня трэба было думаць пра ганарары. Ён проста пісаў вершы. Сёньня хтосьці іх называе філязафічнымі, хтосьці эстэцкімі. Ён аказаўся вышэйшым за падзел на вёску і горад.

Жодынь Аркуша выпхнуў, падабраў Полацак. Пераезд у Полацак стаўся чарговым нонканфармісцкім крокам да творчай і духоўнай незалежнасьці. Старажытны, легендарны Полацак не сустракае паэтаў пірагамі з сочывам, але ён абавязкова непрыкметна «прышчэпіць» чалавеку пачуцьцё патрэбнасьці ягонага творчага самараскрыцьця. Ён мудры – Полацак. Ён заўсёды прыцягвае да сябе патрэбных людзей, і ня толькі зь беларускіх земляў – але і з Польшчы, Нямеччыны, Галяндыі, Францыі, Швэцыі.

Раней «варагі» рабіліся выкладчыкамі ў Полацкай езуіцкай акадэміі, адначасова працуючы на карысьць усёй Полацкай зямлі. Гэтак было, і гэтак зноў робіцца. Полацак дазволіў Алесю Аркушу заснаваць выдавецкую суполку «Полацкае ляда», выдаваць кнігі і андэграўндны альманах «Ксэракс Беларускі», дазволіў стварыць альтэрнатыўнае Саюзу пісьменьнікаў Беларусі

Таварыства вольных літаратараў, у якое ўвайшлі пісьменьнікі з усёй рэспублікі. Сёетое пакрысе зьдзяйсьняецца зь яго задумаў. І, дзякуй Богу, цяпер гэта ня лічыцца злачынствам, і КДБ, напэўна, ужо за ім ня сочыць. Бо паэт існуе ня толькі, каб пісаць вершы, але і для таго, каб матэрыялізаваць свае, на першы погляд, вар'яцкія ўяўленьні аб годнасьці, волі, справядлівасьці. Ня кожнаму гэта зразумела. Нехта зноў згадае ідэалізм. Сапраўды, дух – нешта ідэальнае, асабліва высокі дух. Пры слове «дух» я заўсёды згадваю аблокі.

Жодынь, са сваёй караценькай, у большай частцы ідэалягічнай, гісторыяй, пакуль не разумее сэнсу дальнабачнай палітыкі вялікага Полацку. Ён яшчэ не ўсьведамляе сябе як штосьці цэльнае, са сваімі інтарэсамі і сваёю годнасьцю. Гораду без нацыянальных традыцый яшчэ доўга прыйдзецца пазбаўляцца путаў былога таталітарызму, «вытраўляць» правінцыйнае таўро. Яшчэ ня хутка зьявяцца тут друкарні, нацыянальны тэатар, літаратурнае жыцьцё.

Але ўжо трэба пра гэта марыць. Недзе тут сёньня нараджаецца новы паэт, які застанецца на сваёй малой радзіме.

Вось такое крыху наіўнае эсэ. Але яго высновы і сёньня гучаць актуальна.

## МАСТАКОЎСКАЕ АСЯРОДЗЬДЗЕ

У Жодзіне 1970–1980-х гадоў я ня меў ніякага літаратурнага асяродзьдзя. Гэта мяне прыгнятала. Затое вакол было шмат мастакоў – мой стрыечны брат Сяргей Казлоўскі (ён стаў архітэктарам), браты Андруковічы, браты Ступаковы, Толя Чычын, Уладзімер Гладкевіч (у традыцыйных джонленанаўскіх (круглых) акулярах), Праскуракоў Юры Фёдаравіч, сябры звалі яго Юфам, паводле першых літараў імя і імя па бацьку, бо быў ён старэйшы за іх усіх. Гэтыя хлопцы-аматары маляваньня, за выключэньнем Чычына і Гладкевіча, жылі на ДРЭСе. Пэрыядычна жодзінскія мастакі рабілі выставы ў фае кінатэатру «Юность». Я перад кінасэансам зь цікавасьцю разглядаў іх карціны. Зь некаторымі мастакамі-студэнтамі амаль штодзень езьдзіў электрычкай у Менск на заняткі. Існавала стракатая студэнцкая электрычкаўская сябрына. У дарозе быў час і пагаманіць, і ў карты згуляць, і піва выпіць, і канспэкт пачытаць. Мне было цікава з мастакамі. Пад іх уплывам пачаў хадзіць на выставы ў менскі Палац мастацтва. Спадабаліся: Мікалай Селяшчук, Валеры

Славук, Уладзімер Савіч. Пазьней у выставачных залях зьявіўся нефігуратыўны, авангардны жывапіс, але мне па-ранейшаму падабаўся Селяшчук. Неяк выпадкова даведаўся, што разам зь Селешчуком у тэатралцы вучыўся Праскуракоў, ён нават зь Міколам жыў у адным студэнцкім пакоі. Пачаў распытваць пра любімага мастака. Даведаўся, што Селяшчук быў упартым і працавітым шкаляром, любіў мастацтва прыбалтыйскіх рэспублік, штолета туды езьдзіў. У красавіку 1985 году я патрапіў у яго майстэрню разам зь сябрамі чырваназьменаўскага літаб’яднаньня «Крыніцы», якім кіравала Раіса Баравікова. Былі Шніп, Славамір Адамовіч, Дзьмітрук… Амаль усе карціны, якія паказваў Мікола, аказаліся знаёмыя па выставах. Запомнілася, як Селяшчук апавядаў пра пакуту першага мазка пэндзлем: спачатку ён доўга хадзіў вакол чыстага палатна, баяўся парушыць яго цнатлівасьць, усялякім чынам адцягваў гэтую хвіліну – піў гарбату, думаў, нешта згадваў – рыхтаваўся, як спартовец перад заліковай спробай…

У траўні таго ж году адбылася цудоўная выстава групоўкі Селяшчук–Савіч–Славук–Тоўсьцік–Альшэўскі–Янушкевіч–Ксяндзоў. Я быў у захапленьні. Ад Праскуракова даведаўся, што Славук мае жодзінскія сувязі.

Выстава ягоных працаў была арганізавана ў Жодзінскім палітэхнікуме, у якім я вучыўся да войска. Сёньняшняя клясыка беларускай графікі вісела без нагляду на сьценах пашарпаных калідораў. Да таго ж бацькі Славука на той час жылі ў пасёлку Зялёны Бор, куды мастаку зь Менску трэба было дабірацца праз Жодзіна. Яшчэ большыя сувязі з маім родным горадам меў Ксяндзоў. З 1963 году ён там жыў, вучыўся ў СШ № 2 і № 4, пачаў маляваць у студыі Алеся Марачкіна, які ў той час таксама жыў у Жодзіне і выкладаў маляваньне ў СШ № 4. Але гэта былі людзі зусім іншага пакаленьня, зусім зь іншага раёну гораду – мне не знаёмыя. З Марачкіным я пазнаёмлюся пазьней – у Полацку, на адкрыцьці яго пэрсанальнай выставы ў тагачаснай гарадзкой мастацкай галерэі, якая месьцілася ў Богаяўленскім саборы. А з Ксяндзовым толькі пазалетась – на прэзэнтацыі ў полацкай мастацкай галерэі выставы «Майстар і майстры (Гаўрыла Вашчанка і вучні)».

«Дрэсаўская» мастацкая «рунь» мела свайго «гуру» – Анатоля Шыбікіна, настаўніка маляваньня нашай СШ № 1. Мастак-аматар, вайсковец-адстаўнік, ён штолета наладжваў для сваіх вучняў-студыйцаў пленэры-выправы. Неяк мастацкая сябрына на чале зь

дзядзькам Анатолем пару тыдняў жыла на хутары майго дзеда. Вядома, тое адбылося не без удзелу стрыечнага брата Сяргея. Мае знаёмцы-мастакі былі ўсе расейскамоўныя, нацпытаньне сярод нас не закраналася нават у прыватных размовах, прынамсі, я такога ня памятаю. Гэта ў другой палове 1980-х (у Жодзіне мяне тады ўжо не было) хваля нацабуджэньня дасягнула тамтэйшага мастацкага асяродку. Прынамсі, браты Андруковічы, Канстанцін і Мікалай, сталі сябрамі суполкі мастакоў «Пагоня».

Лёсы «дрэсаўскай багемы» скласіся па-рознаму. У Наваполацак, яшчэ раней за мяне, пераехаў Коля Ступакоў (у тэатралцы ён вучыўся ў адной групе з Адамам Глёбусам). Зрабіў некалькі росьпісаў і мазаічных пано на будынках нафтаграду. У мастацкім жыцьці Полаччыны практычна ня ўдзельнічаў, неўзабаве мастацтва закінуў увогуле. Не хапіла амбіцыяў? Глёбус казаў мне, што Коля быў хлопцам здольным і арыгінальным.

На адной з калектыўных выставаў у Палацы мастацтва я набыў карціну Селешчука «Дзяўчына з Палесься», якая і сёньня ўпрыгожвае маю полацкую кватэру. Патраціў амаль палову грошай, зробленых у будатрадзе.

## БЕЛАРУСКІ ВУПРАЖНЫ

Неяк атрымаў журналісцкае заданьне ў «Рабочей смене»: напісаць пра жодзінскі конезавод «Зарэчча». Знаходзіцца ён побач з пасёлкам ДРЭС: перайшоў масток праз Плісу – і да канторы гаспадаркі рукой дастаць. Сустрэў мяне адзін з сэлекцыянэраў беларускага вупражнога каня Ўладзімер Гладэнка. Ён адказаў на мае пытаньні і падараваў сваю кнігу «Белорусская лошадь» (Менск, 1976). Кніга пачынаецца з апісаньня паходжаньня тутэйшых коней:

Паводле хронік XII–XIII стст. у Полацку, Тураве, Менску, Берасьці адбіралі найбольш моцных буланых («палавыя коні») для фармаваньня конных палкоў («харугваў»)… Мэтадам народнай сэлекцыі выведзены абарыгенныя коні (лясны, палескі, беларускі), якія адпавядалі гаспадарчым патрэбам чалавека… У беларускіх коней чэрап карацейшы, але шырэйшы, чым у коней мангольскага кораня… За апошнія 100 гадоў конь (беларускі вупражны. – Аўт.) выводзіўся мэтадам складанага вытворніцкага скрыжоўваньня жарабцоў заводзкіх пародаў з абарыгеннымі ляснога тыпу маткамі і наступным разьвядзеньнем помесяў «у сабе»…

Пасьля сустрэчы з Гладэнкам мы з братам Віктарам наладзілі фатасэсію для беларускіх вупражных. Нядаўна тыя нэгатывы і здымкі я адшукаў. Цікавы матэрыял. Мой артыкул пра коней у «Рабочей смене» зарэзалі, затое надрукавалі ў «Чырвонай змене».

Беларускі вупражны конь. «БелАЗ». Ёсьць тут пэўная пераемнасьць. Прынамсі, у слове «беларускі» і ў прызначэньні – «перавозіць цяжкія грузы».

## КАРЫСНЫ ВЫКАПЕНЬ

У другой палове ХХ стагодзьдзя Жодзіна імкліва ўварвалася ў «эліту» беларускіх гарадоў. Адбылося гэта дзякуючы будаўніцтву Беларускага аўтамабільнага заводу. На лёс невялічкага мястэчка паўплывалі дзьве акалічнасьці: яго месцазнаходжаньне – на шляху з Масквы ў Эўропу – і тутэйшыя балоты зь іх багатымі радовішчамі торфу. Спачатку ў Жодзіне зьявілася чыгуначная станцыя, затым, з улікам транспартных выгодаў і навакольных пакладаў торфу, электрастанцыя на беразе ракі Плісы, затым – завод тарфянога машынабудаваньня «Торфмаш», які неўзабаве і ператварыўся ў БелАЗ. Усе гэтыя этапы станаўленьня Жодзіна

шчыльна пераплеценыя зь лёсам маёй сям'і: мой дзед, Антон Козік, быў начальнікам чыгуначнай станцыі (прызначаны ў 1938 годзе), мае бацькі амаль палову жыцьця аддалі працы на Жодзінскай ЦЭЦ, а я сам нейкі час працаваў у канструктарскім аддзеле БелАЗу. У Жодзіне ёсьць помнік жодзінскаму самаскіду. Лічу, варта жодзінцам ушанаваць і галоўны беларускі карысны выкапень – торф. Дзякуючы яму, няхай сабе і ўскосна, Жодзіна дасягнула росквіту. Сымбалічна, што імя ракі Плісы, на берагох якой стаіць мой горад дзяцінства, мае балцкі корань і перакладаецца як «балота». Акрамя Плісы шанавалі мы, дрэсаўскія падлеткі, і возера Судабаль, на якім днямі прападалі з вудамі – тут цудоўна лавіліся карасі. У прыбярэжных хмызох хавалі чаўны, грузілі на іх свае ровары, на якіх дабіраліся да возера (ад дому кілямэтры чатыры), і амаль на цэлы дзень сплывалі ў бяскрайнія аеравыя «джунглі». Возера няўхільна зарастала, глыбіня вады ў ім ледзь дасягала паўмэтру – далей твань. У 1980-х з Судабалі пачалі здабываць сапрапэлі, якія выкарыстоўваюцца ў сельскай гаспадарцы ў якасьці ўгнаеньня і дамешку ў корм жывёле, – вялізны земснарад пампаваў тую твань па трубах на адмысловыя пляцы для сушэньня. А неўзабаве беларускія газэты пачалі пісаць пра цудадзейныя мэдычныя

якасьці судабальскай гразі. Высьветлілася, што Судабаль – адзінае возера ў Беларусі, якое адпавядае ўсім 33 пунктам мэдычных патрабаваньняў да лекавых сапрапэляў. Гразь з майго возера пачалі цыстэрнамі вазіць у Менск у гразелячэбніцы. Вось такія яны – балоты ў ваколіцах Жодзіна.
Жодзінская ЦЭЦ (за маім дзяцінствам яна называлася Смалявіцкая ДРЭС) першапачаткова працавала на торфе. Яго вазілі цеплавозы па вузкакалейках з навакольных торфапрадпрыемстваў. Аднойчы мне пашчасьціла пракаціцца па торфачыгунцы. Адзін месяц лета я звычайна праводзіў у піянерскім лягеры «Чайка», які належаў СмалДРЭСу. Месьціцца ён на беразе Плісы за некалькі кілямэтраў ад гораду. Ці ня самае запамінальнае ўражаньне тых гадоў – вандроўка на возера Пясочнае. Да пасёлку Зялёны Бор дабіраліся «дрэсаўскім» цягнічком на адмысловых адкрытых плятформах, прыстасаваных для перавозкі людзей. Некалькі гадоў таму на падобным цеплавозіку мне ладзілі экскурсію ў польскую частку Белавескай пушчы. (Гайнаўская калейка засталася яшчэ ад пачатку XX стагодзьдзя – ёй немцы вывозілі лес з пушчы.) Тады і згадалася мая дзіцячая вандроўка на Пясочнае.

У 1980-я жодзінская электрастанцыя перайшла на мазут і газ, вузкакалейку на Зялёны Бор разабралі. Шкада! Сёньня можна было б прыстасаваць яе для турыстычных патрэбаў. І ня толькі... Зважаючы на апошнія паліўна-энэргетычныя канфлікты з Расеяй і прагнозы на сусьветную нафтавую нішчымніцу напрыканцы нашага стагодзьдзя, варта было б вузкакалейкі аднавіць. Ну не «БелАЗамі» ж вазіць торф на электрастанцыі і хімічныя прадпрыемствы!

## ЖОДЗІНСКІ МІТ

Доўгі час гісторыя гораду майго дзяцінства пачынала сваё летазьлічэньне з 1963 году, калі гарадзкому пасёлку Жодзіна быў нададзены статус гораду абласнога падпарадкаваньня. За апошнія пяць гадоў беларускія гісторыкі і краязнаўцы, добра папрацаваўшы ў архівах, выявілі больш шляхетны радавод гораду. Вынікам гэтай працы стала выданьне кнігі г. І. Аніскевіч «Жодино: история и современность» (Менск, 2003). Сёньняшні міт Жодзіна «прывязаны» да клясычнага полацкага. Па-першае, прызнана, што адпачатку гэта было крывіцкае паселішча, бо ў X–XIII стст. землі па берагох Плісы ўваходзілі ў склад Полацкага княства. Па-другое, канчаткова замацавана ў

мясцовай краязнаўчай літаратуры, што назва гораду паходзіць ад назвы рачулкі Жодзінка, якая ўпадае ў Плісу.
Таксама дакумэнтальна пацьверджана, што мястэчка на сутоку Жодзінкі і Плісы заснаваў князь Багуслаў Радзівіл. З клясычнай гарадзкой структурай плянаваньня: у цэнтры – рынкавы пляц з царквой і крамамі, ад якога разыходзяцца вуліцы.

Упершыню ў пісьмовых крыніцах Жодзіна згадваецца ў інвэнтары маёнтку Смалявічы за 1643 год пад назвай Багуслава Поле. Трэба меркаваць, што паўстала яно на месцы ранейшага невялікага селішча з назваю Жодынь (або Жодзін), з часам старая назва перамагла новую. Яго месца адшукаў гісторык і археоляг Міхась Ткачоў, які ў 1960-х гадох жыў у Жодзіне і выкладаў гісторыю ў СШ № 3. У 1970-х ён правёў некалькі археалягічных дасьледаваньняў у межах гораду і выявіў сьляды селішча эпохі раньняга жалеза на высокім правым беразе Плісы – амаль на тэрыторыі СмалДРЭС. А пры ўпадзеньні Жодзінкі ў Плісу знайшліся рэшткі селішча часоў Полацкага княства. У невялікім культурным пласьце, ад 30 да 50 сантымэтраў, траплялася кераміка XI–XIII стст. Усе пералічаныя тут мясьціны –

прастора майго дзяцінства. А на сутоку Жодзінкі і Плісы я любіў лавіць рыбу.

Дачыненьне да Жодзіна мае яшчэ адзін вядомы гісторык і археоляг – Мікалай Крывальцэвіч. Ён выхоўваўся ў Жодзінскай школе-інтэрнаце.

Каб замацавацца ў беларускай старажытнай гісторыі, жодзінцы плянуюць усталяваць помнік заснавальніку гораду – князю Багуславу Радзівілу.

## ЖОДЗІНСКІЯ АМБІЦЫІ

У караценькай біяграфіі для сайту «litara.net» я назваў Жодзіна, месца свайго нараджэньня, самым амбітным горадам Беларусі. Падстава для гэткага сьцьверджаньня сур'ёзная: Жодзіна выпускае на канвэеры самыя вялікія аўтамабілі на нашым кантынэнце. З кнігі Аніскевіч я даведаўся, што ў Жодзіне ў 1991 годзе быў сабраны самы вялікі на той час у сьвеце (!) кар'ерны самаскід «БелАЗ» грузападымальнасьцю 280 тонаў, а цяпер канструктары аўтазаводу працуюць над 300-тоньнікам. Ці не праява амбіцыяў! Бо ўласна для Беларусі такія самаскіды не патрэбныя – мы ня маем вялікіх кар'ерных распрацовак каштоўных выкапняў. Над праектамі

падобных аўтагігантаў сёньня працуюць толькі аўтамабільныя канцэрны ЗША і Японіі. Вялікагрузныя самаскіды амаль як касьмічныя караблі, яны пад завязку напічканыя электронікай. І каштуюць адпаведна – мільёны даляраў.

Торф стаўся толькі штуршком да развою Жодзіна. На ім былі зароблены першыя дывідэнды: атрыманы ўласныя кілявaты электраэнэргіі, ад торфапрадпрыемстваў паступілі замовы на вытворчасьць торфаздабывальнай тэхнікі і абсталяваньня. У выніку зьявіліся працоўныя месцы – і моладзь з навакольных вёсак масава пацягнулася ў былое мястэчка. Жодзінскі праект у 1960-х пачаў шукаць свой уласны шлях. Хто мог падумаць, што ім стане вытворчасьць кар’ерных самаскідаў і аэрадромных цягачоў?

## ПАХ ЛЯДАНУ Ў БІБЛІЯТЭЦЫ

Жодзіна ніколі не было цэнтрам культурнага і духоўнага жыцьця беларускага краю. Багуслава Поле за часамі Радзівілаў – гэта невякае паселішча з двума вадзянымі млынамі, дзьвюма драўлянымі цэрквамі, сядзібамі рамесьнікаў ды некалькімі корчмамі. На сярэдзіну ХХ стагодзьдзя ў Жодзіне «ад старыны» захавалася толькі драўляная Міхайлаўская царква, якая была

разбураная ў 1962 годзе. Старое царковішча зь велічнымі стогадовымі ліпамі было маім любімым месцам у горадзе. Сёньня ад тых ліп амаль нічога не засталося. Ужо дарослым я даведаўся, што ахрышчаны я быў у доме настаяцеля Сьвята-Міхайлаўскай царквы. Вядома, таемна. У 1966-м у папоўскім доме зрабілі дзіцячую бібліятэку. Менавіта яна стала маёй першай бібліятэкай, якую і сёньня я згадваю з удзячнасьцю. Скрыпучыя масьнічыны, кніжныя паліцы, на якіх дазвалялі самому выбіраць кнігі, дзіўны прыемны пах (сёньня я разумею – гэта «спадчынны» пах васковых сьвечак і кадзільнага лядану).

ВЯДОМЫЯ ЖОДЗІНЦЫ

Жодзіна дала Беларусі шмат вядомых людзей. Літаратарам і выдаўцом стаў Уладзімер Сіўчыкаў, мастакамі – Мікалай і Канстанцін Андруковічы, Уладзімер Гладкевіч, архітэктарамі – Сяргей Казлоўскі1 і Аляксандар Трухін2.
Сярод вядомых жодзінцаў асобнае месца займае Дзьмітры Сямёнаў, які ў 1990 годзе ў сямнаццацігадовым узросьце адагнаў самалёт у Стакгольм. Студэнт жодзінскага палітэхнікуму набыў білет на рэйс Менск–Мурманск і з дапамогай муляжа гранаты РГ-

42 апынуўся ў сталіцы Швэцыі. Хлопец, відавочна, быў надзвычай амбітны. Пра яго шмат пісалі газэты. Зарабіўшы сабе скандальнае імя, Дзіма стаў мастаком і, пасьля непрацяглага турэмнага зьняволеньня (Швэцыя выдала СССР тэрарыста з умовай несуворага пакараньня непаўналетняга), скіраваўся на Захад зарабляць пэндзлем.

Жнівень, 2004

1 Сяргей Казлоўскі працуе начальнікам упраўленьня рэгуляваньня забудовы камітэту архітэктуры, горадабудаўніцтва і землекарыстаньня Менскага гарвыканкаму.
2 Аляксандар Трухін – аўтар праекту царквы ў гонар абраза Маці Божай Менскай (Менск, Чыжоўка, асьвячоная ў 2000 г.) і шэрагу іншых праектаў праваслаўных культавых будынкаў, дыплямант нацыянальных архітэктурных фэстываляў у 2000 і 2003 гг.

## Гесэ, вярблюды і войска

1

З Азіяй я пазнаёміўся дзіцем. Мне яшчэ не было двух гадоў, калі майго бацьку накіравалі працаваць на электрастанцыі ў гарадку Тасонцэнгеле на паўночным захадзе Манголіі. У сьнежні 1962 году маладая беларуская сям'я – гаспадар, яго жонка і сын – накіраваліся з Масквы цягніком ува Ўлан-Батар. Надзіва лёгка мне далося тое цяжкое падарожжа, якое доўжылася амаль тыдзень. Маці чытала Маршака і Чукоўскага, а я імгненна запамінаў паэтычныя радкі і слова ў слова паўтараў за ёй. Мае здольнасьці заўважыла суседка па купэ, якая пачала нахвальваць маці яе таленавітага сына і нечакана папрасіла аддаць ёй яго на вучобу, бо яна – вядомы балетмайстар і едзе ўва Ўлан-Батар ствараць мангольскі нацыянальны балет. «Я зь яго зраблю выдатнага артыста». Маці катэгарычна адмовілася і нават спужалася гэткай прапановы. Як гэта можна аддаць роднае дзіця чужому чалавеку?! З балетам мы канчаткова разышліся ў розныя бакі.

Тасонцэнгел (часам яго называлі, нават у дакумэнтах, проста Тасон) аказаўся мястэчкам, якое месьцілася ў лагчыне сярод

гор на беразе імклівай ракі Ідэр. На ўсход ад Тасону, побач з горадам Мурэн, Ідэр зьлівалася з ракой Дэлгер-Мурэн і ўтварала легендарную раку Селенгу, якая ўпадае ў Байкал. Край гэты быў дзікі і малаабжыты. Ад Улан-Батару да Тасону людзі дабіраліся пераважна на самалёце або на конях ці вярблюдах. Дарогі ў гэтых мясцінах былі грунтовыя, часовыя (летнія) і хутчэй нагадвалі сьцяжыны ў стэпе, мастоў праз рэкі практычна не існавала. У цэнтры гарадка савецкія будаўнікі ўзьвялі пасёлак аднатыпных дамоў-катэджаў на дзьве сям'і, у якіх жылі пераважна спэцыялісты з СССР. З ускраінаў пасёлак атачалі мангольскія традыцыйныя юрты. Гарадок паўстаў пасьля таго, як тут пабудавалі дрэваперапрацоўчы камбінат і – для ягоных патрэбаў – невялікую ЦЭЦ. Былі ў Тасоне свой клюб, у якім савецкія спэцыялісты адзначалі сьвяты (самым любым і вясёлым быў, вядома, Новы год), больніца, школа, крамы, пошта. Тавары – пераважна расейскія і кітайскія. Маімі любімымі прысмакамі ў Манголіі сталі савецкія карамэлькі «Тэатральныя» і кітайскія (а можа віетнамскія) сушаныя бананы (у Беларусі сушаныя бананы ў 1960-х былі экзотыкай). У краме скрынкамі прадаваліся белыя курапаткі й глушцы, можна было

купіць апэльсіны, мандарыны ды чырвоную ікру ў трохлітровых кадушках.

Гэта быў мала крануты цывілізацыяй край. У навакольных горных лясах часам сустракаліся загорнутыя ў матэрыю трупы памерлых манголаў. Дзеці прыроды вярталіся ў прыроду без пасярэдніцтва могілак.

Мужчыны ў вольны час тут займаліся выключна паляваньнем і рыбалкай. Я сам у чатырохгадовым узросьце напрактыкаваўся й цягаў вудаю харыюсаў з Ідэру, здаецца, рукі дасюль памятаюць трапяткія, пругкія рыбіны цельцы. Аднойчы з бацькам за дзень мы нацягалі іх поўны пляцак – 150 штук. Але бацька быў аматарам іншай здабычы – тайменяў. Гэта вялікая драпежная рыба сямейства ласосевых, яна дасягае 60-кіляграмовай вагі і даўжыні паўтара мэтру. Такія экзэмпляры бацьку не трапляліся, а вось каля 10 кіляграмаў – даволі часта. Вяленыя кавалкі тайменяў у нас увесь час віселі на вялікіх сталёвых круках на гарышчы дому, а сырое мяса круглы год ляжала ў склепе, які быў як лядоўня – зямля летам глыбока не адтайвала. Лавіў бацька тайменяў на сьпінінг – браў корак ад віна, абцягваў яго мышынаю шкуркай, пачапляў некалькі якарных кручкоў. Вось прынада й гатовая. Закідвай у

плыню ракі й сачы, калі вялікая рыбіна дзеўбане па «мышыне». Усё астатняе залежыць ад твайго ўменьня змагацца з тайменем і трываласьці тваёй рыбалоўнай снасьці.

Палявалі тут галоўным чынам на качак, часам трапляліся дзікія гусі. На выходныя ў летне-восеньскі сэзон савецкія спэцыялісты на аўтобусе калектыўна выяжджалі на рыбалку або паляваньне. Часам гэтыя заняткі спалучалі – крыху парыбачаць, крыху папалююць. Без здабычы ніколі не вярталіся. Праўда, бацьку ня вельмі шанцавала на паляваньні, але час ад часу ён усё ж прыносіў падстрэленых качак. Я заўсёды чакаў яго з тых паездак і адразу лез у ягоны паходны пляцак. Зь нейкім страхам і жалем я разглядаў мёртвых птушак. Дзівіўся прыгажосьці качараў, гладзіў па пёрах, уздымаў шыі ўгору, расьцягваў крылы. Птушкі не ажывалі. Я толькі аднойчы папрасіў у бацькі стрэліць з паляўнічай стрэльбы – проста ў паветра. Страляць па качках мне не хацелася.

Жанчыны і дзеці хадзілі ў лес у грыбы і ягады. Тут расьлі кусты агрэсту, чорных парэчак, сустракаліся чарніцы, дзікі часнык.

Паводле прызнаньня бацькоў, у дзяцінстве я быў неўтаймоўным вісусам. Ня шкоднікам, а менавіта няўрымстам, з-за чаго ўвесь час трапляў у розныя гісторыі, – мяне трэба было пільна сачыць. Аднойчы ў чатырохгадовым узросьце я наладзіў экспэдыцыю ў горы, загітаваўшы аднагодкаў (і нават некалькіх школьнікаў, якія прыехалі да бацькоў на канікулы – зімой яны вучыліся ў інтэрнаце ўва Ўлан-Батары). Выправіліся мы ў горную пячору, у якой, паводле расказаў старэйшых, жылі манахі-будысты. У гарах здаецца, што ўсё, што бачыш – блізка, а насамрэч да бліжэйшай сопкі ня менш за пяць кілямэтраў. Я ўжо ня памятаю, ці патрапілі мы ў тую пячору, а вось адшукалі нас бацькі на зьмярканьні, ушчэнт стомленых. Добра мне тады дасталося бацькавай папругі.

У Тасонцэнгеле здарылася й адна з самых страшных гісторый, зьвязаных са мной. Было мне тады тры гады. Мая маці, якая была цяжарная маім меншым братам, выправілася на шпацыр да будоўлі моста праз Ідэр і ўзяла мяне з сабой. Мост быў амаль гатовы, заставалася зашаляваць некалькі дзірак. У адну зь іх я й праваліўся, пасьпеўшы, як у якім галівудзкім фільме, зачапіцца рукамі за бэльку. Маці спахапілася, а сына нідзе няма, і тут бачыць: вісіць яе сынок моўчкі над

горнай, імклівай ракой – яна адразу й згубіла прытомнасьць. Адзін з мужчынаў падбег да мяне і выцягнуў на мост. Гісторыі гэтай я ня памятаю, а як спрабую штосьці згадаць – ува мне ўсё сьціскаецца нейкім паралізуючым жахам. На дзіва – я не баюся вышыні, мастоў і горных імклівых рэк.

Роды ў мамы потым прайшлі ўдала. Майму брату выпала ня толькі нарадзіцца ў МНР, але і скончыць у гэтай азіяцкай краіне дзесяцігодку. Але пра гэта ў наступным разьдзеле.

Разьвітваючыся з маім бацькам, манголы, якія працавалі зь ім на электрастанцыі, падаравалі яму дзьве старажытныя бронзавыя статуэткі Буды. Гэта быў знак вялікай павагі.

Вярнуліся ў Беларусь мы ў сьнежні 1965-га, мне было ўжо пяць гадоў. Але на гэтым мае знаёмствы з Азіяй ня скончыліся, праз 13 гадоў я зноў накіраваўся ў Манголію.

## 2

У Мангольскую Народную Рэспубліку я зноў выправіўся цягніком, але без бацькоў – адзін, бо меў ужо 18 гадоў і быў студэнтам Жодзінскага палітэхнікуму. Дарэчы, з гэтай

самай прычыны мае бацькі, зьехаўшы другі раз у Манголію ў 1977 годзе, мяне з сабой не ўзялі – я быў паўналетні. З бацькамі паехаў толькі мой меншы брат Віктар. У МНР я плянаваў правесьці ўвесь жнівень.

Але спачатку цэлы месяц афармляў паперы на выезд. Авіраўцы, акрамя розных анкетаў, запатрабавалі характарыстыку зь месца вучобы і дазвол на выезд ад ваенкама. З характарыстыкай праблемы не паўстала – сумленны камсамолец, складкі плаціць своечасова, удзельнічае ў грамадзкім жыцьці, шкодных звычак ня мае. А вось ваенкам заўпарціўся, маўляў, зьедзеш, а пасьля шукай цябе – а ў войску хто будзе служыць? Улагоджваць ваенкама хадзіла цётка Ліда, якая апекавалася маім халасьцяцкім жыцьцём на радзіме. Паперчыну з подпісам яна расстаралася з другога ці трэцяга разу пасьля скандалу. Ваенкам дазвол даў, але й паабяцаў праблемы прызыўніку, які гойсае па заграніцах.

Атрымаўшы замежны пашпарт, я накіраваўся ў менскі «Інтурыст» набываць квіток. На дварэ стаяў 1978 год. Квіток каштаваў 54 рублі 14 капеек.

Пра тое, як я ехаў у цягніку Масква–Улан-Батар, можна напісаць асобную кнігу,

штосьці на ўзор Венядзікта Дарафеева ці якога іншага майстра падарожных нататак савецкага часу. Гэтую справу пакінем да наступнага разу, бо мусім пачаць іншы аповед.

Білет у мяне быў не да Ўлан-Батару, а да мангольскага гораду Дархан, дзе я мусіў перасесьці на цягнік да Эрдэнэту. Мае бацькі дапамагалі брацкаму народу ўзводзіць тамтэйшы медна-малібдэнавы камбінат. Гэта была будоўля веку. Маскоўская «Правда» ледзь не праз нумар асьвятляла дасягненьні на савецка-мангольскім працоўным фронце. Трубіла ў медна-малібдэнавыя трубы. Як і ў першы свой прыезд у Манголію, бацька працаваў на электрастанцыі.

Мяжу памятаю цьмяна, дарога так стаміла, што ўсё навокал бачылася як за запацелым шклом. Хістаючыся, быццам зялёны матрос пасьля першага шторму, я выйшаў на пэрон Дархану. Тут мяне ўжо чакаў бацька. Мы набылі квіткі «для праезду ў цьвёрдым вагоне новабудоўлі Мінтрансбуду» і селі ў цягнік, які мусіў нас даставіць у Эрдэнэт. Цягнік быў наладаваны такой стракатай чалавечай масай, што я напачатку перапужаўся. Я ўторкнуў твар у акно і моўчкі разглядаў дзіўныя краявіды. Краявіды нагадвалі

вэстэрн – дзікі стэп, сопкі, а за імі горы. Далягляд расквечвалі плямкі статкаў – авечкі, коні, часам сярод іх невялікія купкі вярблюдаў. Здавалася, зараз выскачаць на конях індзейцы і, з ваяўнічым гіканьнем, пагоняцца за цягнікам. А той, бедачына, так марудна целяпаўся, што яго можна было дагнаць на ішаку.

Эрдэнэт мяне нічым не зьдзівіў. Гэта быў кавалачак СССР сярод мангольскіх сопак – са звыклымі шматпавярховымі панэльнымі дамамі і шматлікім расейскамоўным людам.

Назаўтра, наведаўшы тутэйшыя крамы, я ўсё ж заўважыў істотнае адрозьненьне ад тагачаснай эсэсэсэраўскай рэчаіснасьці. Быў уражаны ня тым, што побач з крамамі заўжды сустракаў навязаных коней і нават вярблюдаў. І ня тым, што грошы тут выглядалі інакш і называліся *тугрыкамі*. Мяне зьдзівіў тавар у крамах. Ён быў таксама савецкі, але які тавар! Распушчальная кава, індыйская гарбата, ікра – чырвоная і чорная, тушонка, любыя мясныя і рыбныя кансэрвы, каўбасы. І ўсё ў вольным продажы. Карацей, поўны разьвіты сацыялізм. Яшчэ большае зьдзіўленьне ў мяне выклікала мясцовая кнігарня, што знайшла прытулак у звычайнай кватэры на першым паверсе аднаго зь

пяціпавярховікаў. У мяне разьбегліся вочы ад дэфіцытных маскоўскіх выданьняў. На маёй радзіме за такімі кнігамі людзі стаялі ў чэргах дні й ночы. У першы ж дзень я набыў стос кніг, сярод іх выбранае Германа Гесэ з раманам «Стэпавы воўк». Цэлымі днямі ў мангольскай кватэры бацькоў я чытаў і чытаў, бо асабліва не было куды хадзіць і на што глядзець. Пазьней мой Гесэ гуляў па ўсім наргасе, у які я паступіў пасьля войска. Празь некалькі гадоў, калі я пазнаёміўся з Гесэ ўсходнім, напрыклад, зь ягоным «Сыдхартам», я зразумеў, чаму лёс пагнаў мяне другі раз у тую Цьмутаракань. У кожнай падзеі ёсьць таемны сэнс. Часам дзеля таго, каб зразумець самае звычайнае і простае, напрыклад, што такое зямля, спачатку варта набыць досьвед нечага супрацьлеглага, кантраснага, у нашым выпадку – адчуць бязважкасьць палёту.

А Манголія пасьля дарослых уражаньняў у мяне атаясамляецца зь любаю кнігай у чорнай вокладцы, якую я запоем чытаў у дзікіх стэпах і цяпер захоўваю як найвялікшую каштоўнасьць, з пукатымі сопкамі, на якіх вясною цьвітуць тульпаны, зь невядома як узьніклым сярод гэтых сопак і гор звычайным савецкім мікрараёнам, зь вярблюдамі, якія мэлянхалічна жуюць свой орбіт бяз цукру, зь юртамі, якія атачаюць

статкі авечак, зь людзкімі тварамі, нібы апрацаванымі пескаструменным агрэгатам, зь дзіўнай песьняй на незнаёмай гартаннай мове, якую пачуў у цягніку, што нетаропка, як у сьне, вёз мяне ў горад разьвітага сацыялізму ў постфэадальнай краіне.

## 3

Ваенкам не падмануў цёткі Ліды – праблемы з войскам у мяне сапраўды ўзьніклі. Позву я атрымаў на 18 траўня 1979 году. З Манголіі тэрмінова прыехаў бацька. Ён арганізаваў усё як мае быць – на праводзіны сабраліся сябры, якіх было ўжо няшмат, бо большасьць прызвалі ў войска на пачатку траўня. Пад жарты й сьмех гасьцей зьляцелі долу мае доўгія валасы.

І якое было зьдзіўленьне бацькі й сваякоў, калі позна ўвечары 18-га я вярнуўся дахаты. «Што, зьбег?» – дапытваўся бацька. «Вярнулі, – разгублена і стомлена прамармытаў я ў адказ. – Кажуць, не было маёй каманды, далі новую позву, яшчэ тыдзень гуляць». Гэтаму тыдню я асабліва ня ўзрадаваўся. Лысым цягацца па горадзе і кожнаму стрэчнаму тлумачыць, чаму ня ў войску? Ніякага задавальненьня!

Праз тыдзень мяне зноў вярнулі.

Бацьку гэта страшэнна ўзлавала. Яму трэба было з дня на дзень вяртацца ў МНР. Назаўтра разам зь ім мы едзем у нейкі армейскі штаб у Менску. «Забірайце ў войска сына. Куды я яго дзену? Мне праз два дні трэба зьяжджаць». Дабрадзей-палкоўнік выпісаў паперку і загадаў прывезьці прызыўніка заўтра ў штаб арміі ў Печы пад Барысавам. Наступнай раніцай паехалі ў Печы. «Напэўна, зноў блатны», – перамовіліся між сабой афіцэры ў штабе. І адзін зь іх у мяне пытаецца: «У танкі хочаш?» «Не, не хачу», – адказваю. «Ну, а камандзірам хочаш быць?» – «Камандзірам хачу». Так я апынуўся ў самай крутой мотастралковай сяржанцкай вучэбцы ў Печах, пра якую дасюль ходзяць жахлівыя гісторыі.

Афіцэр праводзіў мяне ў казарму і загадаў старшыну роты выдаць абмундзіраваньне. «Завялікае», – сказаў я старшыну, памераўшы яго. «Завялікае не замалое, – зьедліва адказаў ён, – іншага няма». «Вось і пачынаецца», – падумаў я.

Акрамя старшыны ў казарме нікога не было, курсанты майго прызыву ўжо месяц пазнавалі сакрэты салдацкага рамяства – яны былі на палігоне. Я застаўся іх чакаць.

Увечары казарма раптам загудзела й закалацілася. У салдацкі дом вярталіся яго жыхары. Мая рота месьцілася на трэцім паверсе – курсанты мусілі імкліва забягаць наверх па лесьвіцы. Няцяжка ўявіць, які стаяў грукат ад сотні кірзавых ботаў.

Мае будучыя баявыя таварышы ўляцелі ў казарму як віхор – замызганыя, усе ў пыле, стомленыя, са шклянымі галоднымі вачыма. Праз пяць хвілін пачалося шыхтаваньне. Камандзір роты прадставіў мяне курсантам і сяржанцкаму складу. Я ўжо ведаў, што буду залічаны ў трэці ўзвод і што я нарадзіўся ў кашулі (так мне сказаў старшына): замкамузводу («замок») трэцяга ўзводу быў мой знаёмы Косьця Бараноўскі, які скончыў Жодзінскі палітэхнікум на год раней за мяне.

Рота прыняла папаўненьне дваяка: як чужака (які месяц адвалыніў) і як ахвяру (маўляў, і табе заўтра дастанецца). Курсанты былі амаль усе зь Беларусі, траціну майго ўзводу складалі менчукі. Хлопцы з Азіі былі толькі ў танкістах і на кухні, як быццам кухараў да вайсковых катлоў адмыслова выпісвалі з Азэрбайджану або з Туркмэністану. «Ня сцы, усё будзе нармальна», – супакоіў мяне Косьця.

Ніякім капцёршчыкам, хлебарэзам або пісарам я ня стаў. Прайшоў усе тыя ж

печанскія кругі, як і мае таварышы. Адно што маральна мяне ніхто не даставаў – парашу за правіны ня мыў, ротны кулямёт на стрэльбы на плячах не цягаў і па пяць разоў на дзень не перашываў падкаўнерыкі. Чуў, што цяпер у войску баявыя стрэльбы бываюць 2–3 разы за службу. У нас яны былі 2–3 разы на тыдзень. І дзённыя, і начныя, і ў газаахоўніку, і з бэтээра, і з аўтамата, і з кулямёта, і з гранатамёта. Ніхто ў нас не зьбіраў страляныя гільзы. Больш за тое – нашыя кішэні былі поўныя цэлых набояў, ракетніцаў (накшталт хлапушак) і выбуховых пакетаў, якія нам выдавалі на тактычных вучэньнях. Настраляліся ўволю. Цынкі з набоямі старшына прывозіў на бэтээры. «Каб усё расстралялі, не зьбіраюся за вамі здаваць рэшту на склад», – строга папярэджваў ён. Нягледзячы на свой слабаваты зрок, страляў я добра, часам на выдатна.

Так доўжылася паўгоду. Добра, што я быў прызваны ўвесну. Не ўяўляю, як падобная вучоба адбываецца ўзімку.

Скончыў я вучэбку адразу ў званьні сяржанта, як выдатнік. Патрапіў у каманду, якую везьлі ў Берасьце.

Тут мяне й чакала неспадзяванка: на самым захадзе СССР я напаткаў Азію. Але ўсё па парадку.

Прывезьлі мяне ў батальён, які займаўся перагрузкай вайсковых грузаў на чыгунцы. Як вядома, савецкая чыгуначная каляіна шырэйшая за эўрапейскую, у тым ліку і польскую. Таму вайсковыя эшалёны трэба было перагружаць з адных вагонаў у другія вагоны. Гэтым у Берасьці займаўся адмысловы батальён. У адну з такеляжных ротаў гэтага батальёну я й прыбыў на месца камандзіра аддзяленьня.

Дзяжурны па батальёне адвёў мяне ў казарму. Гісторыя паўтарылася: у казарме амаль нікога не было – рота працавала на рампе. Чакаць давялося нядоўга – вайсковыя такеляжнікі павінны былі вярнуцца ў часьць на абед.

Як у казцы: зноў загрукацела, завыла, загуло – у казарму ўляцеў натоўп жанеўраў. І, божачкі, амаль ніводнага славянскага твару. Так мне адразу падалося.

Роту пашыхтавалі ў казарме. Гэтым разам я патрапіў у першы ўзвод. Камандаваў узводам даўгалыгі, крыху прыгорблены малады прапаршчык, які зусім не выглядаў на строгага, крутога камандзіра. Першае

ўражаньне хутка спраўдзілася. Прапаршчык прайшоўся ўздоўж шыхта. Узвод *дзядоў*. Усе яны былі аднаго прызыву – праз паўгоду павінны дэмбельнуцца. І я павінен быў імі камандаваць! Нехта з жаўнераў незаўважна падскочыў да прапаршчыка ззаду і ссунуў яму фуражку на вочы. Узвод па-азіяцку гучна зарагатаў. «Бяззубенка, навядзіце парадак ува ўзводзе», – нейкім жаноча-пісклявым голасам даў каманду прапаршчык. «Есьць, таварыш камандзір!» – казырнуў невысокі, каржакаваты сяржант, як высьветлілася, «замок» узводу. Ён падскочыў да жартаўніка і сadanуў нагой яму ў грудзі. «Харош, Зуб, я пажартаваў!» – пачаў апраўдвацца той. «Ня Зуб, а таварыш сяржант! Ты не ў сваім кішлаку! Я жраць хачу, а ты час марудзіш! На абед пара, – і, зьвяртаючыся да ўсяго ўзводу, выгукнуў: – Хопіць зубы скаліць!» Усё гэта было добра прыперчана адборным расейскім матам. Парадак усталяваўся. Прапаршчык даў нейкія распараджэньні, і рота пачала высыпацца на вуліцу, каб шыхтавацца на абед.

Амаль штоночы *дзяды* пілі таннае віно й гарэлку (запасны выхад у казарме быў засланы пустымі пляшкамі). З радзімы ім дасылалі й розныя экзатычныя напоі, якуюсьці чачу або чэмэргес, і нават

наркотыкі. А яшчэ *дзяды* любілі пасьля адбою глядзець у ленкомнаце польскую тэлевізію. Ставілі *духа* на шухер і зь піўком ды вінцом, балазе вінна-гарэлачная крама знаходзілася насупраць КПП, гадзінамі, нічога не разумеючы па-польску, зачаравана пазіралі на малюнкі незнаёмага, таямнічага жыцьця.

І зноў мне пашанцавала. Бяззубенка аказаўся нармальным мальцам з Магілёва, ён па-зямляцку ўзяў нада мной шэфства. Вядома, ніхто мяне ня слухаўся, але й не кантаваў – Зуб эфэктыўна перапыняў любыя нестатутныя дачыненьні. «Зубы павыбіваю, калі будзеш чапаць яго. Ён твой камандзір – зразумеў?!» Гэтак ён тлумачыў сваім байцам мой статус ува ўзводзе.

Роту складалі пераважна выхадцы з Узбэкістану, Азэрбайджану, Казахстану й Таджыкістану, з украпленьнямі грузінаў і туркмэнаў. Грымучая сумесь. Былі, праўда, хлопцы зь Беларусі, Расеі, Украіны й Прыбалтыкі, але яны надвор'я тут не рабілі. Любімым заняткам байцоў падчас адпачынку ў казарме было паляваньне на Сасіпатрава (хлопца з Волагды, ён служыў у трэцім узводзе мэханізацыі, жаўнеры якогая працавалі на рампе на пагрузчыках). Быў ён высокага росту, у круглых «джонленанскіх» акулярах,

тоўсты й страшэнна аброслы валасамі, асабліва на сьпіне. Такіх валасатых людзей я ніколі больш ня бачыў. Калі Сасіпатраў з голым торсам абліваўся вадой ува ўмывальні, то нагадваў маманта ці якога пячорнага мядзьведзя. У азіятаў адразу спрацоўваў паляўнічы рэфлекс. Яны пачыналі «паляваць» на хлопца па казарме – кідаць тапкамі й ботамі, некаторыя наскоквалі ззаду на сьпіну. Сасіпатраў, як сапраўдны мядзьведзь, круціўся й скідваў іх долу.

У 1980 годзе, падчас палітычных падзеяў у Польшчы, мы спалі не распранаючыся з аўтаматамі пад ложкамі. Дзякуй Богу, нікуды нас не накіравалі. У гэты час шмат пайшло з захаду (асабліва з Усходняй Нямеччыны) старога ўзбраеньня. Часам з пагрузчыка звальвалася долу драўляная скрыня – адчынялася вечка, і па асфальце рассыпаліся аўтаматы або пісталеты, бязладна ў тыя скрыні насыпаныя. На захад ішло шмат вагонаў з харчамі – сухпайкі, мука, цукар, крупы. Самым складаным і цяжкім быў груз зь мясам. Вайсковыя такеляжнікі называлі яго «голыя бабы», бо зь ім было шмат еб…ні. *Дзяды* звычайна на такі груз не хадзілі, таму мне пашанцавала – замарожанай «эротыкі» практычна не паспытаў. Мяса прыходзіла ў рэфрыжэратарах – каровіны тушы,

расьсечаныя ўздоўж напалам. Пагрузчык тут мала дапамагаў, амаль усё рабілася ўручную.

Праз паўгоду я праводзіў сваіх басмачоў на дэмбель. Разьвітваючыся, Бяззубенка сказаў: «Не давай паслабону, сядуць на шыю!» І перадаў мне замкамузводзтва.

Неўзабаве ў ізалятар, які часова зрабілі з батальённай спортзалі, прывезьлі моладзь. Мяне прызначылі кіраваць папаўненьнем. Там я й пабачыў свой новы ўзвод. На 80 адсоткаў гэта зноў былі прадстаўнікі Азіі. Некаторыя зусім кепска гаварылі парасейску. Шыхтом яны хадзілі як клоўны, бязладна махаючы рукамі з падвоенай амплітудай. «Азія! Шыхтуйся!» – роў я на сваю такеляжную брыгаду й чарговы раз накручваў зь імі кругі па стадыёне.

Адзін з маіх байцоў стаў хлебарэзам, другі – апальшчыкам у батальённай лазьні (відавочна, за хабар). Іх я бачыў толькі перад адбоем. Астатніх трэба было трымаць у абцугах. Вельмі хутка яны пачалі ня слухацца свайго камузводу-прапаршчыка. Асабліва на палітзанятках (звычайна камузводу проста чытаў вайсковы статут або палітычныя навіны з газэтаў). «Таварыш сяржант, навядзіце парадак!» – скамандаваў камандзір мне. Я браў у рукі вялікую шахматную дошку

і кідаў яе ў самага нахабнага. Амаль хвіліну па ўсёй ленкомнаце з грукатам разьляталіся драўляныя фігуркі. На нейкі час усталёўвалася цішыня.

За год службы перачытаў амаль усю расейскую клясыку, якая была ў батальённай бібліятэцы. Таксама любіў глядзець польскую тэлевізію, асабліва музычныя праграмы. Дасюль памятаю кліп Suzi Quatro – яна стаяла на подыюме, і ў твар ёй ляцела лістота.

2005

KAMUNIKAT.org

## Вяртаньне ў «Тутэйшыя»

Шмат разоў прасіў былых «тутэйшаўцаў» напісаць успаміны і ўкласьці кнігу. Прасіў Бяляцкага, Сыса, іншых. Той-сёй нешта напісаў, пераважна неістотнае і, часам, непраўдзівае. Такім чынам, зноў замест адказаў пакідаем пытаньні... Пакуль канчаткова ня выпетрыліся з галавы падрабязнасьці тых падзеяў, паспрабую занатаваць старонкі гісторыі, сьведкам якой быў асабіста, балазе, маю вялікі архіў - лісты, дзёньнікавыя запісы, тагачасныя газэтныя публікацыі. Спадзяюся, некалі ўспаміны «тутэйшаўцаў» нехта руплiва зьбярэ ў кнігу. Адразу папярэджу, што ў «Тутэйшых» быў шараговым сябрам, у ніякія кіраўнічыя органы не ўваходзіў, і таму ня ведаю «вышэйшых сакрэтаў». Прынамсі, доўгі час я лічыў, што «Тутэйшыя» паўсталі выключна з ініцыятывы Бяляцкага й Сыса, сяброў па гомельскім «унівэры». Але пазьней, у сярэдзіне 90-х, Генадзь Сагановіч паведаміў мне, што Б. і С. былі ўсяго толькі выканаўцамі, а ідэя стварэньня суполкі належыла іншаму чалавеку, які насамрэч кіраваў ёю. Гэтае прызнаньне падобнае да праўды, я асабіста веру ў тое. Аднак дакладна сьцьвярджаць ня маю права, бо, паўтаруся, ня быў далучаным да таямніцы.

І яшчэ адна заўвага. Я асабіста лічу, што «Тутэйшыя» існавалі датуль, пакуль у дзейнасьці літсуполкі прысутнічала рызыка, таямнічасьць і кансьпірацыя. Калі аб'яднаньне «Тутэйшыя» вырашыла легалізавацца й ператварылася ў Таварыства маладых літаратараў пры СП БССР, суполка сканала.
Каб патрапіць у «Тутэйшыя», патрэбна была рэкамэндацыя. Мне такую рэкамэндацыю даў Анатоль Сыс. З Анатолем я пазнаёміўся ў ліпені 1986 году ў рэдакцыі часопіса «Маладосьць», куды пэрыядычна заходзіў па навіны да Яўгеніі Янішчыц. Да маіх першых вершаваных спробаў вядомая паэтка паставілася прыхільна й, пасьля азнаямленьня з рукапісам, сказала: «Будем ставіць». Аднак папрасіла прынесьці яшчэ адну нізку вершаў, каб выбраць лепшае. Прыхільнасьць вядомае паэткі не азначала, што ставіць будуць заўтра, ці ў гэтым месяцы, ці ў гэтым годзе. Упершыню Янішчыц адабрала мае вершы для друку ў верасьні 1985 году. А мой дэбют у «Маладосьці» адбыўся ажно ў чэрвені 1987-га. Я чуў з аповедаў дасьведчаных людзей, што чакаць даводзіцца доўга. Але каб столькі!.. Час чаканьня цягнуўся марудна й пакутліва, а вершы ў часопісе ўсё не зьяўляліся. Некалькі разоў я заходзіў да Янішчыц, каб пацікавіцца: калі ўжо, нарэшце? Яна прыязна

пасьміхалася й запэўнівала, што ўсё нармальна, але трэба пачакаць яшчэ, маўляў, чарга. У адзін з такіх візытаў я й пазнаёміўся з Сысам. Летам 86-га легендарнаму паэту «новай хвалі» мяне прадставіў Віктар Шніп, якога я ведаў па літаб'яднаньні «Крыніцы», што пад апекай Раісы Баравіковай працавала пры газэце «Чырвоная зьмена». Дарэчы, на «Крыніцах», яшчэ напачатку 85-га, я пазнаёміўся і з Адамам Глёбусам, і з Славамірам Адамовічам, і зь Людкай Сільновай. Культавае Глёбусаўскае апавяданьне «Слон» я ўпершыню пачуў у аўтарскім чытаньні ў рэдакцыйным пакоі «ЧЗ», і друкавалася яно ўпершыню ў гэтай камсамольскай газэце. Больш нідзе б не надрукавалі. Баравікова любіла Валодзю Адамчыка. Але я ня памятаю, каб у «Чырвоную зьмену» заходзіў Сыс. Першая мая размова з Анатолем доўжылася больш двух гадзінаў. Ён апавядаў пра «Талаку», з паэтаў вызначаў Галубовіча й Бембеля (апошняга лічыў сваім настаўнікам). Вельмі раўніва ставіўся да Глёбуса. Нядаўні выпускнік «філфаку» гомельскага «ўнівэру» на той час меў усяго некалькі публікацыяў у цэнтральным друку, аднак быў прыкметна сьпешчаны славай і ўвагай. Сыса ўжо ў той час я ўспрымаў, бадай, як жывую легенду, як прыжыцьцёвага клясыка.

Першы зборнік Анатоля Сыса «Агмень» выйдзе ў 1988 годзе ў толькі што створанай сэрыі «Бібліятэка часопіса «Маладосьць». (Зьяўленьне гэтай кніжнай сэрыі пасьля будзе падавацца галоўным дасягненьнем «Тутэйшых».) Зборнік меў парадкавы нумар 3. Мой зборнік «Вяртаньне», які выйшаў неўзабаве за Сысаўскім, меў нумар 5. (Я назваў свой першы зборнік «Немаўля», аднак рэдактар кнігі Леанід Дайнека сказаў, што назва няўдалая, таму ён пераназваў зборнік на «Вяртаньне». Пачуўшы пра гэта, я ня стаў асабліва пярэчыць. Мне, па шчырасьці, да апошняй хвіліны ня верылася, што выданьне маёй кнігі ўвогуле магчыма). Чаму гэта ўзгадваю? Я па сёньняшні дзень не магу даць веры, што ўвайшоў у літаратуру разам з Анатолем Сысам, прынамсі, нашыя першыя кнігі выйшлі ў адзін год. Мне ўсё яшчэ здаецца, што Анатоль, як мінімум, з пакаленьня Галубовіча, або Шніпа. Бо ў нейкім сэнсе ён быў для мяне настаўнікам. Аб новай літаратурнай суполцы, якую зьбіраецца ствараць літмоладзь, я пачуў ад Сыса. Адразу пасьля нашай першай сустрэчы ён пачаў апекавацца мной. Увесь час прасіў прыносіць новыя вершы. Я прыходзіў да яго ў інтэрнат (ён тады працаваў на тэлевізіі й меў ад працы пакойчык). Сыс тэатральна чытаў мае вучнёўскія спробы-вэрсіфікацыі і гэтак

жа тэатральна іх пляжыў, не пакідаючы нават кволай надзеі. Але, напрыканцы свайго разбору прасіў прыносіць вершы яшчэ. Ня ведаю, ці піў ён тады, як п'е зараз. На колькі памятаю, у тыя гады я ніводнага разу ня ўдзельнічаў з Сысам у справе спажываньня алькаголю. Прычым, сустракаўся зь ім амаль штотыдня, бачыў Толіка й на падпітку, але ў большасьці выпадкаў Сыс мне трапляўся цьвярозы. Сёлета Леанід Галубовіч напісаў артыкул пра Сыса для «Нашай Свабоды» (25.07.2000), у газэце зьмешчаны фотаздымак, на якім Сыс і я. Падпісана, што зьнята ў 1990 годзе. На самой справе гэта здымак 1986 году, яшчэ «перадтутэйшаўскага» часу.
У 80-х я вучыўся ў «наргасе», але жыў у бацькоў у Жодыне й штодня езьдзіў на заняткі электрычкай. На другім ці трэцім курсе ў мяне здарыўся канфлікт з дэканам, і той загадаў не даваць «наглецу» месца ў інтэрнаце - прыйшлося да сканчэньня ВНУ дабірацца на заняткі чыгункай. Лісты да мяне ішлі на бацькоўскі адрас. 12 лютага 1987 году я атрымаў па пошце дзіўнае, таямнічае запрашэньне. На кальцы было надрукавана: «у 19.00 Нядзеляй, 15 лютага, па вул. Акадэмічная, 3, п.32 (дакумэнты здаваць на Капліча Валерыя) адбудзецца чарговая сустрэча літаратурнай суполкі Тутэйшыя.

Першым пытаньнем - чытаньне і разгляд драмы Я.Купалы «Тутэйшыя». Другім - абмеркаваньне вершаў новага сябры Тутэйшых. Трэцьцім пытаньнем - праблемы Тутэйшых. ТУТЭЙШЫ»
Я, канечне, паехаў. Хаця, прызнаюся, хваляваўся. Ва ўсім гэтым «свавольстве», відавочна, прысутнічала рызыка. Але цешыла тое, што мне давяраюць, мяне лічаць вартым гэтае рызыкі.
Кожнаму сябру суполкі заўсёды паведамлялі ў запрашэньні, на каго трэба здаваць на вахце дакумэнты, бо вольна ў асьпіранцкі інтэрнат, як і ў любы студэнцкі, не пускалі. Пазначалі розных людзей - нельга было «сьвяціцца» і паказваць, што ўсе прыйшлі па адной справе, у адзін пакой, да аднаго чалавека. Кансьпірацыя. Я і сёньня ня ведаю, хто такі Валера Капліч, да якога я хадзіў на Акадэмічную, 3.
Зь першага паседжаньня запомніліся тры чалавекі: Сяргей Харэўскі, Міхась Талочка і Ігар Бабкоў. Вёў паседжаньне Бяляцкі. Афіцыйна, ледзь не па пратаколу. Высьветлілася, што хлопцы ўжо назваліся «Тутэйшымі», аднак Ніл Сымонавіч Гілевіч, пачуўшы пра гэта, іх моцна раскрытыкаваў і параіў прачытаць аднайменную п'есу Янкі Купалы. Памятаю, што на паседжаньні чыталі п'есу па нейкай старой кнізе, бо гэты твор на

той час быў яшчэ забаронены цэнзурай і ад 20-х гадоў не перавыдаваўся. Харэўскі запомніўся вопраткай: чорны плашч, капялюш - рыхтык агент выведкі з замежнага фільму. Паводзіў сябе сур'ёзна, і вёў выключна «канцэптуальныя» гутаркі. Сыс называў яго «французам».
У капелюшы хадзіў і Талочка. Пазьней я неаднаразова спрабаваў даведацца ў сяброў суполкі: што піша гэты Талочка, і ці піша ён ўвогуле? Усе ў адказ пацпіскалі плячыма. Талочка быў супрацьлегласьцю Харэўскаму - балаболіў абы што, хахміў, рагатаў і сваволіў. Прычым, завіхаўся пераважна вакол Сыса. Я быў хлопцам сур'ёзным і такія людзі мне не пасавалі.
Бабкоў запомніўся зь іншай нагоды: ён аказаўся тым новым сябрам «Тутэйшых», якого мусілі, пасьля абмеркаваньня ягоных вершаў, прыняць у суполку. (Тут у мяне ўзьнікае пытаньне: якім чынам быў прыняты ў «Тутэйшыя» я? Мая творчасьць пры ўступленьні калектыўна не абмяркоўвалася. Напэўна, падзейнічала Сысаўская рэкамэндацыя). Бабкова прадстаўляў Бяляцкі. Новы сябар суполкі чытаў дзіўныя, мэдытацыйныя вершы. Сыс катэгарычна іх не ўспрымаў, называў «шызоідамі». Бяляцкі спрачаўся й некалькі разоў тлумачыў Сысу, чаму ён лічыць гэтыя вершы «файнымі».

«Беларускай паэзіі, - казаў ён, - не хапае мадэрновых, эўрапейскіх твораў». Бабкоў трымаўся сьціпла, відавочна, хваляваўся; здаецца, і не спрабаваў бараніцца.
Але спачатку абмяркоўвалі назоў суполкі. Прачытаўшы некалькі значных урыўкаў з драмы Купалы (бо, каб прачытаць усю драму, бракавала часу), пачалі абмен думкамі. Для мяне гэта было ўсё ў навіну, бо я ня быў яшчэ дасьвечаным у дэталях беларускага нацпытаньня, і нават пра п'есу «Тутэйшыя» чуў упершыню. Ніякай спрэчкі, здаецца, і не было. Усе шукалі аргумэнты дзеля апраўданьня назову. Гучала некалькі вэрсіяў: «Беларусі пакуль няма, таму й беларусаў няма, ёсьць толькі тутэйшыя, а мы іх частка». Гучала і такая вэрсія: «Будзем называцца «тутэйшымі», каб нават сваім назовам цьвяліць сумленьне беларусаў».
Памятаю, што на паседжаньні я сядзеў побач з Алесем Косткам, былым «парнатаўцам», які ў той час уваходзіў у актыў «Талакі». Наведаў паседжаньне й Генік Лойка, аднаклясьнік і сябар Косткі; тады ён служыў у войску ў Менску й неяк здолеў, няхай і са спазьненьнем, патрапіць на гістарычнае паседжаньне. Ня ведаю, ці пісалі тады штонебудзь Костка з Лойкам, бадай што не - наведвалі літсуполку, напэўна, як «сьвядомыя»

хлопцы, так бы мовіць, дзеля ўмацаваньня нацыянальнага духу сярод «тутэйшаўцаў». Вядома, у Жодынь я не паехаў, спазьніўся на апошнюю электычку, начаваў у Сыса. Анатоль зноў тэатральна, уголас чытаў мае вершы. Але гэтым разам ухваліў некалькі, сярод іх, здаецца, «Здрадніка» і «Пушча. Совы».
21 лютага адбылося першае паседжаньне «Тутэйшых» пад дахам Дома літаратара. З гэтага паседжаньня й пачалося тое, аб чым сказаў у сваім інтэрвію Вітаўт Чаропка («Крыніца», №4-5, 2000): «(...) у «Тутэйшых» я быў назіральнікам, як Глёбус сварыўся з Сысам, кожны бок ведаў, як і што пісаць, і даводзіў сваю рацыю».
Гэта было камэдыйнае супрацьстаяньне. І зараз цяжка патлумачыць, за што паміж сабой змагаліся гэтыя два лідэры - адносіны між імі часам межавалі з мардабоем. Рэч ў тым, што ніхто зь іх не прэтэндаваў на кіраўніцтва «Тутэйшымі», безальтэрнатыўным кіраўніком быў Бяляцкі. Кожны з супернікаў меў уласныя перакананьні й свае каманды падтрымкі, у нейкім сэнсе, гэта было «ідэалягічнае» супрацьстаяньне. Сыс узначальваў «патрыётаў», Глёбус - «касмапалітаў». Прыхільнікі Сыса называлі гурт апанэнтаў (Клімковіч, Шайбак, Сьцяпан, Сіўчыкаў) «глябусятнікам». Сыс часта патасна

казаў пра любоў да Радзімы, пра змаганьне за Беларусь. Глёбус - пра прагматычныя рэчы (трэба пісаць дэтэктывы, маляваць коміксы, ствараць мас-культуру). На паседжаньні 21 лютага паміж Сысам і Глёбусам усчалася сварка наконт «Маніхвэста «Тутэйшых». Вядома, Сыс патрабаваў больш радыкальнага зьместу. На гэтым паседжаньні ўпершыню ўбачыў Алега Мінкіна (ён чытаў «тутэйшаўцам» свае вершы) і пазнаёміўся зь Сяргеем Кавалёвым. На паседжаньні трымаўся разам з Паўлам Дзьмітруком, зь якім пасябраваў на «чырвоназьменаўскіх» «Крыніцах».
Наступнае паседжаньне адбылося 14 сакавіка. У мяне захавалася запрашэньне: «у 19.00, суботай, 14 сакавіка, у Доме літаратара (уваход збоку) адбудзецца чарговая сустрэча літаратурнай суполкі ТУТЭЙШЫЯ. Першым пытаньнем - Беларуская мова - праблемы разьвіцьця. Другім - абмеркаваньне вершаў А.Сыса і А.Глёбуса. Трэцьцім пытаньнем - праблемы Тутэйшых. 9.III.87 г. Менск». Гэтае паседжаньне вёў Кавалёў.
Зь лекцыяй пра мову выступіў Вінцук Вячорка. Ня цяжка здагадацца, што ён казаў пра сучасную «кастрыраваную» бел. мову, пра патрэбу вяртаньня старога правапісу, «тарашкевіцы». Як чакалася, шмат эмоцыяў выклікала абмеркаваньне вершаў Сыса й

Глёбуса. Чальцы кожнай «каманды» ганілі суперніка й хвалілі свайго лідэра. Сыс называў паэзію Глёбуса «гудронам» - ён падзяляў вершы на «духовыя» й «недуховыя» (тут, відавочна, адчувалася «школа» Бембеля). Мне асабіста падабаліся вершы абодвух. Я нават нешта сказаў у абарону Глёбуса, нешта пра патрэбу гарадзкой паэзіі.
Запрашэньне на наступнае паседжаньне таксама прыйшло ў Жодынь: «у 18.30, у суботу, 21 сакавіка, у Доме літаратара (уваход збоку) адбудзецца чарговая сустрэча літаратурнай суполкі Тутэйшыя. Першым пытаньнем - беларуская мова ў літаратуры і жыцьці. Другім - творчая і філязофская канцэпцыя М.Шэляговіча, разгляд яго творчасьці. Трэцьцім пытаньнем - аповеды У.Сьцяпана. Чацьвёртым пытаньнем - праблемы Тутэйшых». Паседжаньне вёў Бяляцкі. Госьцем гэтай сустрэчы стаўся новапалачанін Сяргей Сокалаў (тады ён яшчэ ня быў ні Сержуком, ні Воюшам). Госьць з імпэтам прасьпяваў свае «касінерскія» песьні й быў вельмі прыхільна сустрэты Сысам. Затым разглядалі навэлу Сьцяпана «Вонкавае сьвятло». Я чуў гэты твор другім разам, упершыню Валодзя чытаў мне «Вонкавае сьвятло» ў сьнежні 1986 году ў сваёй майстэрні (у падвале пад крамаю «Кнігарня пісьменьніка»). Зразумела, Сьцяпан добра

атрымаў ад «патрыётаў» за «фармалізм». Я ня мог не заступіцца за хлопца, балазе, мне на самой справе гэта рэч падабалася. Без сумніву, яна была зроблена «пад Глёбуса» (з дакладным натуралізмам у маляваньні дэталяў і абавязковым дзёрзкім пратэстам супраць закарузлага жыцьця і «вашых правілаў», як у глёбусаўскім «Слане»), аднак у Сьцяпана аповеды атрымліваліся больш цёплымі, ён ня быў сталічным хлопцам, і вытруціць зь сябе дарэшты местачковасьць, каб паўстаць халодным і неспагадлівым гарадчуком, на ўзор Кая з андэрсаўскай казкі, ня здолеў.
Адносна таго паседжаньня варта працытаваць мой тагачасны ліст да Леаніда Галубовіча: «Сёньня нейкі спустошаны і разьбіты пасьля ўчорашняга паседжаньня «Тутэйшых». Чатыры гадзіны непатрэбных спрэчак, што пераходзілі ў лаянку.
Праўда, пачатак быў цікавым. Музычным. Перад тутэйшымі выступіў Сяргей Сокалаў. Сьпяваў свае песьні, чытаў вершы, адказваў на пытаньні. Было цікава, тым больш, што я чуў яго ўпершыню.
Аднак у другім акце пачалося! Сыс сашчапіўся з Глёбусам і Шэляговічам. Шэляговіч супраць моўнага пункту тутэйшых - размаўляць выключна па-беларуску. Глёбус выказаў цікавую прапанову - стварыць пры

Саюзе пісьменьнікаў маладзёвую сэкцыю. Ён нават падрыхтаваў ліст да Гілевіча. Зь ім не пагаджаюцца - кажуць, гэта стварэньне другога «карыта».
Потым разглядалі навэлу Сьцяпана. Ізноў Сыс усё адмаўляе. Калі з моўным пытаньнем я падтрымліваю Анатоля, дык тут ня вытрымаў. Спробы ў прозе Глёбуса й Сьцяпана мне сымпатычныя. Магчыма, ня ўсё атрымліваецца, але хлопцы стараюцца. Я разышоўся й прабраў Сыса за яго ўсеагульнае адмаўленьне. Які гэта будзе сум, калі ўсе пачнуць пісаць накшталт яго. Гэта толькі пашкодзіць натуральнаму разьвіцьцю беларускай літаратуры. Здаецца, мае словы падзейнічалі. Скончылі паседжаньне бязь пены на губах».
Такім чынам, выглядае, што я таксама падтрымліваў ідэю стварэньня маладзёвай сэкцыі пры СП. На той час, калі нават у п'яным трызьненьні ніхто ня мог уявіць, што раптам абрынецца СССР, і Беларусь атрымае незалежнасьць, прапанова Глёбуса, відавочна, была слушнай. Але ў 90-х гадох я ўжо зусім іначай глядзеў на СП і сяброўства ў ім.
Наступнае паседжаньне «Тутэйшых» адбылося 25.04.1987 г. Вось зьмест запрашэньня: «У суботу, 25 красавіка, а палове сёмай (18.30), адбудзецца паседжаньне маладых літаратараў у Доме літаратара (уваход збоку). Пытаньні: 1.

Мова і літаратура (тэндэнцыі разьвіцьця); 2. Разгляд творчасьці сяброў літаб'яданьня «Узьлёт» (унівэрсытэт). Шчыра запрашаем». Адносна гэтага паседжаньня ў маім дзёньніку няма аніякіх запісаў, напэўна, я на ім ня быў. Таму адразу пераходзім да паседжаньня 4 красавіка. Запрашэньня ў мяне не захавалася, затое ёсьць запісы ў дзёньніку. На паседжаньні разглядалі апавяданьні Міхася Талочкі й Максіма Клімковіча. Сьвежыя ўражаньні ад таго паседжаньня я выклаў у лісьце да Галубовіча за 6.04.87: «Нарэшце, усталявалася працоўная атмасфэра, бяз кпінаў і абразаў. Спачатку разгледзелі апавяданьні М.Талочкі й М.Клімковіча. Абмеркавалі. Абодва працуюць у нетрадыцыйным рэчышчы. Клімковіч у плыні Глёбуса. Талочку цяжка вызначыць - Гарэцкі з дабаўкай сучасных рэалій.

Затым Глёбус паведаміў, як сунуцца справы з маладзёвым саюзам. Са старэйшых пісьменьнікаў ліст да Гілевіча падпісалі Янішчыц і яшчэ 2-3 чалавекі. Астатнія адмаўляюцца. Затое літаратары апошніх прызываў падпісваюць з ахвотай: Пісьмянкоў, Канапелька, Ягоўдзік, Ламан і шмат іншых. Глёбус пераканаў падпісаць ліст усіх тутэйшых. Мы пачалі зьбіраць матар'ял для альманаху. На наступным паседжаньні, 18 красавіка, будуць абмяркоўваць мае

вершы для згаданага выданьня. Калі жадаеш, можаш выбрацца паслухаць. Пачатак у 18.30. Акрамя мяне будуць экзамэнаваць Сяргея Кавалёва».
19 красавіка ў лісьце ў галубовічаўскае Вароніна напісаў: «Ня мог учора прысутнічаць на паседжаньні «Тутэйшых». А мяне павінны былі абмеркаваць. Падвёў хлопцаў...»
25 красавіка ў маім дзёньніку пазначаны як дзень чарговага паседжаньня Таварыства маладых літаратараў (без прыдатка «Тутэйшыя»). На ім зноў выступіў Вінцук Вячорка са спавешчаньнем, якое мела «прыгодніцкую» назву «Прыгоды беларускага правапісу». Затым разглядалі творчасьць сяброў унівэрсытэцкага літаб'яднаньня Галіны Ракоцы, Жанны Пахадні, Славаміра Адамовіча і яшчэ некага.
У гэты дзень адбылося абраньне кіраўніцтва Таварыства. Старшыня: Алесь Бяляцкі. Намесьнікі: Віта Казлова й Сяргей Кавалёў. Адказны за паэзію: Анатоль Сыс. Адказны за прозу: Адам Глёбус. Адказны за дзіцячую літаратуру: Пятро Васючэнка. Адказны за крытыку: Сяргей Дубавец. Адказны за драматургію: Уладзімір Сьцяпан. Адказны за выступленьні: Міхась Талочка.
Упершыню ў гэтых успамінах зьявілася імя Сяргея Дубаўца. Як бачым, будучага

рэдактара NN, які ў той час жыў у Гомелі, завочна абралі ў склад рады Таварыства.
16 траўня на паседжаньні ТМЛ разглядалі мае вершы. На пачатку адбылася гутарка з Анатолем Вярцінскім, тагачасным рэдактарам тыднёвіка «ЛіМ». «ЛіМ» тады дэманстраваў нечуваны дэмакратызм і сьмеласьць. «Тутэйшаўцы» атаясамлялі гэта выключна са сьмеласьцю й сумленнасьцю рэдактара. Сам Вярцінскі казаў, што дэмакратызацыі галоўнага воргану СП спрыяюць найперш павевы часу, маўляў, ягонай заслугі, як рэдактара, тут няшмат. Вярцінскі прапанаваў «тутэйшаўцам» падрыхтаваць старонку ў тыднёвіку.
Памятаю, перад тым, як мяне пачалі разглядаць, Глёбус сказаў: «Ня бойся, сядай побач, калі што - абаронім». Я сеў на вольнае крэсла поруч зь ім. Больш за ўсё мне дасталося за мінімалістычные вэрлібры, маўляў, яны не паэтычныя - гэта сухая канстатацыя рэчаіснасьці, без «мастацкай апрацоўкі». Як і абяцаў, Глёбус пачаў бараніць, ваяўніча паглядаючы на апанэнтаў з-пад насупленага брыва. Падтрымаў і Кавалёў. Абмеркаваньне скончылася неяк вяла й пасьпешліва.
На паседжаньні прагучала абвестка, што сябрам ТМЛ трэба падрыхтаваць адмысловыя

тэчкі з дакумэнтамі: заява, анкета і г.д. Усё як у СП.
На паседжаньні 22 траўня я здаў сваю тэчку. Ня памятаю хто, ці не Янушкевіч, зрабіў спавешчаньне на тэму гісторыі адраджэньня: «Наша Ніва», браты Луцкевічы, Жылуновіч, 20-я гады, рэпрэсіі, гулаг. Адкрыцьцё Курапатаў было наперадзе. У гэты дзень разглядалі апавяданьні Андрэя Федарэнкі. Федарэнку падтрымліваў Сыс, Глёбус скрытыкаваў хлопца ўшчэнт.
Апошні раз я прысутнічаў на паседжаньні ТМЛ 29 траўня. Разглядалі апавяданьне Глёбуса, вершы Людкі Сільновай і хоку Міраслава Шайбака. Чамусьці я «незалюбіў» Мірыкавы трохрадкоўі, і сказаў, што не ўяўляю паэтычны зборнік толькі з хоку, маўляў, гэта будзе аднастайна й сумна.
Вось тагачасныя мае развагі, выкладзеныя ў лісьце да Галубовіча за 30.05.87: «29 траўня было апошняе паседжаньне Таварыства перад летнімі вакацыямі. Пасьля яго багата набегла думак - і ўсе як хмары.
Непакоіць ваяўнічасьць, зь якой прапіхваюць сваю «гарадзкую хвалю» Глёбус і К°. Я прыхільна да яго стаўлюся - і як да творцы, і як да чалавека. Але ўзьнікае небясьпека...
Няхай сабе працавалі ў гэтай хвалі Глёбус, Сьцяпан ды Клімковіч. А то зьбіраецца

«гайня». Моладзь - як матылькі. Бо рэкляма ў іх гучная і нават (паўтаруся) ваяўнічая.
Я прадбачу, што хутка будзе багата гвалту наконт усяго гэтага ў крытыцы. А гэта зноў рэкляма.
Я супраць «групаўшчыны» - аднак нічога не застаецца, як уздымаць іншую «хвалю». Гэта будзе ня цяжка - яна ўжо існуе (Мінкін, Сыс, Сокалаў...) Толькі яе неяк трэба абгрунтаваць тэарэтычна - як у «г.х.» Ад гэтага залежыць (магчыма, я перабольшваю) далейшае разьвіцьцё беларускай літаратуры.
Аднак ніякіх боек. Нават падтрымаць адна адну. Сумленнае спаборніцтва. Час разьбярэцца...»
Гэты мой юначы, наіўны ліст, пасьля прачытаньня яго сёньняшнімі вачыма, зьдзівіў мяне неверагодна. Атрымліваецца, ужо тады я думаў пра Таварыства Вольных Літаратараў. Дзіўна тое, што менавіта Галубовіч, атрымальнік гэтага ліста, напісаў у часопісе «Крыніца», што ТВЛ паўстала з-за крыўды Аркуша, якога не прынялі ў СП.
Сьмерць «Тутэйшых» імкліва набліжалася. Сама форма дзейнасьці літаб'яднаньня сябе вычарпала. Ну, абмеркавалі творчасьць усіх сваіх сяброў. А што далей? Далей было два варыянты: або пачаць змагацца са старэйшымі пісьменьнікамі за часопісную «плошчу» і пазыцыі ў тэмпляне выдавецтва

«Мастацкая літаратура», або заняцца палітыкай. Па гэтым пытаньні зноў адбыўся раскол: частка пачала ствараць «кантору» - з сакратарамі, намесьнікамі і намесьнікамі намесьнікаў, другая частка, разам з чальцамі «Талакі», пайшла на мітынгі. Любая «кантора» павінна мець свой статут. Вось радкі з праекту «Статута Таварыства Маладых Літаратараў»: «Таварыства ўтворана з ініцыятывы маладых творцаў у адпаведнасьці з пастановаю ЦК КПСС «Аб рабоце з творчай моладзьдзю» і дзейнічае пры Саюзе пісьменьнікаў БССР, каардынуючы сваю дзейнасьць з адпаведнымі органамі СП. (...) Таварыства мае права рэкамэндаваць сваіх членаў для ўступленьня ў Саюз пісьменьнікаў БССР і іхнія кнігі для выданьня. (...) Правадзейным членам Таварыства (з правам вырашальнага голасу) можа быць любы, хто мае ня меньш за 2 літаратурныя публікацыі ў рэспубліканскім друку. (...) Прыём у члены ТМЛ праводзіцца Радай ТМЛ на падставе пісьмовае заявы. Апроч заявы аўтар прадстаўляе Радзе публікацыі або рукапісы літаратурных твораў. Пытаньне аб прыёме ў ТМЛ вырашаецца Радай у адкрытым галасаваньні. Члены ТМЛ атрымліваюць членскія білеты. (...) Члены ТМЛ могуць быць выключаны з Таварыства рашэньнем Рады ТМЛ. Падставай для выключэньня ёсць

дзейнасьць або ўчынкі, несумяшчальныя з прынцыпамі і задачамі, сфармуляванымі ў Статуце ТМЛ. (...) У пэрыяд паміж зьездамі кіраўніцтва Таварыствам належыць Радзе Таварыства маладых літаратараў». Ня ведаю, хто аўтар гэтага дакумэнта, але пра «Тутэйшых» у ім ужо ні слова.

Другая частка «Тутэйшых» занялася палітыкай. А якая палітыка без партыйнага друку?! З гэтае нагоды быў заснаваны бюлетэнь «Кантроль». Калі верыць зьвесткам з кнігі «Пазацэнзурны пэрыядычны друк Беларусі (1971-1990)» (Менск, БГАКЦ, 1998), выдавалі пэрыёдык Сяргей Дубавец і Алесь Бяляцкі. Першы нумар «Кантроля» (выйшаў прыканцы 1988 г.) пачынаецца вялікім артыкулам «Дзяды былі за намі», у якім падрабязна апавядаецца пра ўсе акалічнасьці, зьвязаныя са славутымі Дзядамі 30 кастрычніка 1988 г., якія былі жорстка разагнаныя менскай міліцыяй. Як сьведчыць бюлетэнь, Дзяды-88 ад пачатку рыхтаваліся «Тутэйшымі». Заяўку ў Цэнтральны райвыканкам Менску падавалі Алесь Бяляцкі і Анатоль Сыс. Дазволу апазыцыянэры на правядзеньне Дня памяці продкаў не атрымалі. Вось як ананімны аўтар артыкулу апісвае тыя падзеі: «Яшчэ да пачатку Дзядоў пачаўся «хапун». Людзі ў цывільным тыцкалі пальцам у мастакоў М.Купаву і А.Марачкіна.

Была спроба затрымаць старшыню Мартыралёгу Беларусі З.Пазьняка. Ратуючы яго, «заляцелі» адразу аж трое «Тутэйшых»: В.Мартыненка, А.Дэбіш, А.Бяляцкі. Іх забралі, затое Пазьняка народ адбіў. А.Бяляцкага «апрацавалі» сьлезацечным газам з 10 сантымэтраў аэразолем проста ў вочы. Ужо на Курапатах, куды дабралася некалькі групаў, правёў Дзяды тутэйшавец І.Бабкоў, пасьля чаго яго таксама пасадзілі ў машыну. А.Сыс вырваўся з-пад кантролю і прыбег з працы, калі ўсе ўжо разыходзіліся. Астатнія «Тутэйшыя» хадзілі, рассыпаныя між народу. Бачылі, як у прастору паміж міліцыянтамі і народам нехта кінуў плястмасавую цацку-аўтамат: «Страляйце!» Бачылі, як курсанты, счапіўшыся і ціснучы людзей, білі дзяўчынак чаравікамі па лытках, а тыя крычалі. Бачылі, як у ланцугу з плястыкавымі шчытамі і каскамі нехта пасклізнуўся і чалавек пяць, як даміно, паваліліся адзін на аднога. Скандавалі разам з народам: «Ван-дэ-я! Ста-лі-ні-сты!» (...) Тых жа, каго затрымалі, павезьлі ў міліцыю, склалі пратаколы. Бяляцкаму напісалі: «Выкрикивал антисоветские лозунги». Потым зразумелі, што перабралі, пратакол перапісаўся, і зноў пад подпісам сьведкаў пайшла стандартная фармулёўка: «Участие в митинге», за якую Бяляцкі атрымаў у судзе 200 рублёў кары. Пакаралі і І.Бабкова.

Судзьдзя Менскага раёну Мышкавец павучаў яго, што ён ня мае права меркаваць пра Сталіна, а калі даведаўся, што І.Бабкоў антысталініст, уляпіў яму ўсе 200 р.»
Ёсьць у «Кантроле №1» і пра літаратуру: «Таварыства маладых літаратараў «Тутэйшыя» зьвярнуліся да ЦК ЛКСМ Беларусі і Саюза Пісьменьнікаў Беларусі з заявай наступнага зьместу:
«15 мая 1988 года на гадавой нарадзе Таварыства маладых літаратараў пры СП БССР мы - «Тутэйшыя» - прыйшлі да высновы, што нам патрэбны яшчэ адзін - свой - маладзёвы літаратурна-публіцыстычны часопіс. Чаму? Бо часопіс «Маладосьць», ворган ЦК ЛКСМБ і Саюза Пісьменьнікаў БССР разьлічаны пераважна на 30-40-гадовых. Збольшага, там друкуюцца людзі сярэдняга веку з поглядамі і псыхалёгіяй свайго пакаленьня».
Пра гадавую нараду «Тутэйшых» гутарка будзе ісьці ніжэй. Зараз працытуем яшчэ адно цікавае паведамленьне з жыцьця тутэйшаўцаў: «Яшчэ ўвесну сябры «Тутэйшых» А.Сыс, А.Мінкін, А.Глобус былі рэкамэндаваныя ў Саюз Пісьменьнікаў Беларусі. Усе трое пасьпяхова прайшлі абмеркаваньне на сэкцыі паэзіі СП. 17 лістапада адбылося тайнае галасаваньне прыймовае камісіі. Пераадолеў гэты бар'ер

толькі А.Сыс. «Тутэйшыя» зьвярнуліся ў Прэзыдыюм СП з прапановаю перагледзець вырак камісіі. Пра кампэтэнтнасьць цяперашняга яе складу гаворыць тое, што ў СП разам з Сысам трапілі З.Марозаў, А.Камароўскі, К.Жук. Знаёмая пазыцыя апаратнага чыноўніка - новы работнік не павінен быць больш здольным і разумным, чым я, бо інакш ён можа адціснуць мяне ад карыта. І вось, у асобе Марозава, Камароўскага і Жука прыходзіць у літаратуру ня заўтрашні, а ўчорашні яе дзень». Такім чынам, у СП падаліся амаль усе лідэры «Тутэйшых». Ім Таварыства маладых літаратараў ужо не было патрэбнае. СП заставаўся адзіным легітымным шляхам у вялікую літаратуру. Альтэрнатыўны шлях нават не разглядаўся.

Бюлетэнь «Кантроль №2» (1.89) атрымаўся зусім не цікавым. Нумар сьведчыў аб хуткім заняпадзе Таварыства. «У канцы сьнежня прайшла вечарына «Тутэйшых» на філфаку БДУ. Слабая арганізацыя яе прывяла да сумнай колькаснай раўнавагі тых, хто выступаў, і тых, хто слухаў». Аднак «Тутэйшыя» працягвалі змагацца з «прыкарытнікамі». Хто гэта такія, тлумачылася наступным чынам: «ПРЫКАРЫТНІКІ. Так назвала літаратурная моладзь банду літаратурных дыназаўраў,

акапаўшыхся ў Саюзе Пісьменьнікаў БССР, якія памагалі калянізатарам душыць Беларускую культуру і нішчыць Беларускую мову, ды галасілі ў сваіх творах нібы пра «росквіт» гэтай забіванай культуры, ды вясёлае жыцьцё падняволенага народу пад управай Крамлёўскіх стаўленікаў. Міхаіл Мінскі (пражывае ў СССР) апавядае аб тым, як жыў адзін з гэтых верных слугаў панявольніка - «беларускі пісьменьнік» Пятрусь Броўка: «Дом быў стараветны, з высачэзнымі столямі, з мармуровымі сходамі... На першым паверсе быў дзіцячы садок, другі паверх займаў вялікі паэт Пятрусь Броўка, на трэцім паверсе жыў акадэмік Мацэпура, а апошні займаў архітэктар і прафэсар Чантурыя... Кожнаму прыпадала па паверху, пакояў гэтак на 10-12... Стукаю да Петруся Броўкі. Адчыніла мне пакаёўка з чэпчыкам на валасах і павяла да памяшканьня. На ўсім шляху тоўстыя кілімы, гэткія хіба да рэвалюцыі тут ляжалі. Прывяла да вітальнага пакою і пасадзіла ў крэсла... У дзіцячым садку скардзіліся: яны ня могуць праводзіць музычную гадзіну, таму што паэт Броўка думае сваю вялікую думу і не дазваляе пяяць і граць на піяніне, таму што музыка адганяе ягоную музу... Броўка меў і некалькі дачаў, аўтар апісвае ягоныя ходаньні, каб адстаяць свае дачы, калі адну ў яго хацелі

забраць. Так выглядалі і выглядаюць гэтыя так званыя «народныя паэты», верныя паслугачы Маскоўскага рэжыму. За верную працу калянізатар умее шчодра плаціць!» Кватэры, дачы й ганарары «прыкарытнікаў» не давалі спакою тутэйшаўцам. Але на іх долю гэтых шчадротаў ужо не хапіла. Як «чорная хмара», насоўваліся часы «перабудовы».
1988 год стаўся лебядзінай песьняй «Тутэйшых». Нават наладжаная гадавая нарада Таварыства не прынесла якіх-кольвечы вынікаў.
3-га траўня ў Наваполацку я атрымаў паштоўку ад Бяляцкага з наступным паведамленьнем: «Шаноўны Алесь! Мабыць табе У.Арлоў трохі нешта гаварыў, але я яшчэ хачу больш дакладна перадаць. 15 траўня (мая), у нядзелю, у 11.00, у Доме Літаратараў будзе праходзіць рэспубліканская нарада «Тутэйшых». Вырашылі праводзіць іх раз у год-два, каб спыніцца, паразважаць, пагледзець назад і падумаць аб будучым. Абавязкова прыяжджайце зь Сержуком, вазьміце Бурдыку, калі ён ня супраць. Праезд будзе аплочаны ў два бакі адразу ж. Трэба нам усім хоць зрэдку зьбірацца. Будзем мы тут прыймаць дэкларацыі, пастановы (наконт школак, мовы і г.д.), можа і ў вас ёсьць канструктыўныя ідэі - падумайце, калі ласка. Увечары будзе вечарына. Чакаем. Алесь

Бяляцкі. Запрашаем гасьцей з Эстоніі, Латвіі, Літвы».
Ня памятаю, ці паехаў на нараду Сяржук Сокалаў-Воюш, а я з Бурдыкам на рэспубліканскім мерапрыемстве быў. Павал Бурдыка зьяўляўся сябрам наваполацкага літаратурнага аб'яднаньня «Крыніцы». Нейкі час я працаваў разам зь ім на адным прадпрыемстве - наваполацкім заводзе «Вымяральнік». У 1991 годзе ў Полацкай друкарні мы разам выдалі зборнік вэрлібраў «Тайніца», які стаў першым беларускамоўным выданьнем, што пабачыла сьвет у Полацку пасьля ліквідацыі Галоўліту. (Ці не апошняй беларускамоўнай полацкай кнігай быў альманах маладнякоўцаў «Зарніцы», 1928 г.)
На нараду сабралася багата маладых літаратараў, бадай з усіх куткоў Беларусі. На жаль, я не пакінуў падрабязных запісаў аб тым, што адбывалася падчас паседжаньня. У маім дзёньніку пазначана, што згадваліся Дзяды-88, ішла гутарка пра ўласны альманах, адбылася стыхійная дыскусія на тэму «Літаратура й грамадзкі абавязак». У дзёньніку я пакінуў прозьвішчы тых, хто выступаў: Глёбус, Мінкін, Акулін, Шалкевіч, Бабкоў... З таго дня помніцца зусім іншае. Па сканчэньні паседжаньня Сыс, Дранько-Майсюк, Вольга Куртаніч, Бурдыка і я выправіліся ў больніцу адведаць Пімена

Панчанку. Ён неяк няўдала паваліўся (ці не ва ўласнай кватэры?), зламаў сабе скабы. Здаецца, прапанаваў схадзіць да клясыка Сыс. Шкадую, што я ў той дзень не сфатаграфаваў народнага паэта. Панчанка жартаваў і апавядаў пра сваё фліртаваньне зь дзяўчынай-мэдсястрой. Цытаваў напісаны ёй верш. У Панчанкі й Сыса былі на той час асаблівыя дачыненьні - яны сталіся апанэнтамі. Панчанка напісаў верш «Разьвітаньне», у якім казаў пра незваротны заняпад беларускай мовы.

*Родны Янка Купала,*
*Вы пісалі:*
*«Я веру - настане...»*
*Дарагі мой Іван Дамінікавіч,*
*Не, не настане!*
*Гэта ўжо не сьвітаньне,*
*Гэта наша настала зьмярканьне,*
*Гэта з мовай маёй,*
*Гэта з песьняй маёй*
*Разьвітаньне.*

Верш спачатку быў надрукаваны ў «ЛіМе», а затым у зборніку «Горкі жолуд» і выклікаў у беларускай сьвядомай інтэлігенцыі шок. Вядома, Панчанка на тое й разьлічваў. «Тутэйшыя» мусілі адказаць. Сыс напісаў

верш «Прачытаўшы верш Пімена Панчанкі «Разьвітаньне».

*Родны мой Пімен Панчанка,*
*Вы сказалі: настала зьмярканьне?*
*Вы сказалі на маці мачыха?*
*Бо настала Вам разьвітаньне?*
*(...)*
*Вы жывымі сьлязьмі заплачыце,*
*за паэтам народ убачыце*
*скрозь расстаньне і скрозь зьмярканьне,*
*Вам за сьмерць сваю прыкра стане,*
*бо пад небам Сафіі полацкай*
*на народных паэтаў моляцца.*

Але ніякіх нацягнутых адносінаў паміж імі не паўстала. Сыс мне казаў, што прасіў прабачэньня ў Панчанкі за свой верш. Той, нібыта, супакоіў, маўляў, чакаў і спадзяваўся, што нехта падобным чынам яму запярэчыць. Калі з Панчанкам надарылася бяда, Сыс ледзь не штодня наведваў яго ў шпіталі. Пры нас ён размаўляў з Панчанкам па-сяброўску, як далучаны, як пераемнік. Калі наша дэлегацыя выйшла зь лякарні, я прапанаваў усім разам сфатаграфавацца на памяць, што мы й зрабілі.

*Полацак, 2000*

## Аскепкі вялікага малюнку

Калі Ігар Бабкоў пасьля першага майго дня ў сталіцы Францыі запытаўся: як Парыж? — я, не міргнуўшы вокам, адказаў: фігня, капіталістычны прымітыў. Полі Вэрлены ды Мадыльяні на вуліцах не сустракаліся, Гіёмы Апалінэры ды Паблы Пікасы ў кавярнях кавы не пілі, а ля гранітнага ўзьбярэжжа Сэны ніхто не зачытваўся раманамі Камю ды Сартра. Гэта раздражняла. Якая ж пасьля гэтага Парыж культурная сталіца Эўропы! Бабкоў, відавочна, палічыў, што я „клею гарбатага“.

Я, далібог, быў шчыры.

Гэтак жа можа здарыцца, калі вы ўпершыню прыедзеце ў Полацак. Неаднойчы чуў у ягоны адрас: правінцыя, глухамань, дзірка, балота, дзіч... Нават калі вы заканспэктуеце кнігу Уладзімера Арлова „Таямніцы полацкай гісторыі“ і вывучыце на памяць верш Рыгора Барадуліна „Полацкі мэнталітэт“, ніякай гарантыі мець ня будзеце. Ну, пабачыце Сафійку, заўважыце ў расповедзе экскурсавода прыкрыя гістарычныя хібы, дакранецеся рукой да „мацерыковых“ радоў плінфы, праслухаеце паўгадзінны арганны канцэрт, сфатаграфуецеся на тле Барысавага каменя; ну, укленчыце ля ра́кі з мошчамі

сьвятой Эўфрасіньні Полацкай, складзеце ў Спаскай царкве малітву за беларускі народ, а калі пашанцуе, прыкладзецеся вуснамі да дубліката Крыжа Эўфрасіньні, які вырабіў наш сучасьнік Мікола Кузьміч; ну, паблукаеце ўздоўж парослых хмызьняком дзьвінскіх берагоў, зноў-такі, калі пашанцуе, знойдзеце „барацінку“; ну, наведаеце сем полацкіх музэяў, у музэі беларускага кнігадрукаваньня пабачыце арыгіналы кніг Вацлава Ластоўскага, таго, які напісаў пра Полацак легендарныя „Лябірынты“ — тэкст-шыфр, тэкст-напамін, тэкст-запавет; ну, патрапіце на чарговы турнір рыцараў з клюбу „Жалезны воўк“; ну, наведаеце ўніяцкую царкву сьвятой Параскевы Полацкай, пабачыце там абраз сьвятога Язафата Кунцэвіча, які зрабіў для палачанаў Алесь Пушкін, даведаецеся, што храм у сярэдзіне 90-ых збудаваў за пару гадоў айцец Бэнэдыкт, якога неўзабаве пасьля Полацку, у трыццацігадовым веку, прызначылі генэралам манаскага ордэну студытаў; ну, наведаеце касьцёл сьвятога Андрэя Баболі і даведаецеся, што мошчы сьвятога Андрэя раней захоўваліся ў Полацку, а цяпер іх трымаюць езуіты ў Варшаве (калі я хацеў летась сустрэцца з пробашчам санктуарыя сьвятога Анджэя Баболі ў Варшаве і прадставіўся сакратарцы журналістам з Полацку, дык мяне старанна

пазьбягалі ўсе тры дні, пакуль я дамагаўся аўдыенцыі ў варшаўскіх езуітаў); ну, пабачыце рэшткі бэрнардынскага касьцёла сьвятой Ганны, заглянеце за плот псыхіятрычнай лякарні, якая месьціцца ў жылых карпусах былога кляштара бэрнардынаў; ну...

І што з таго, калі вы ўсё гэта пабачыце-пачуеце-дазнаецеся? Калі вы не гатовыя зразумець Полацак, наўрад ці вас крануць турыстычныя славутасьці старажытнага гораду на Дзьвіне.

Паэт-пчаляр з Пружаншчыны Мікола Папека наведаў Полацак упершыню сёлета ў красавіку, прыехаўшы атрымаць літаратурную прэмію Таварыства Вольных Літаратараў „Гліняны Вялес“ за лепшую мастацкую кнігу году. Вядома, я, як гаспадар, мусіў паказаць шаноўнаму госьцю легендарныя мясьціны. Пасьнедаўшы, мы выправіліся пешшу да Сафійскага сабору. Ішлі ўздоўж берага Палаты да пешаходнага мастка праз рачулку, затым нетаропка, аглядаючы прыгожыя краявіды, падняліся на ўзгорак да Сафійкі. Найперш падышлі да Барысавага каменя. Валун са старажытнымі надпісамі Папеку ўразіў надзвычайна. Паэт старанна, на зрок і навобмацак, вывучаў

камень, як селянін каня на кірмашы. Саму Сафійку ён аглядаў без энтузіязму — вядома, паганец. Затое камень увесь час не выходзіў у яго з галавы. Блукаючы са мною па вулках веснавога гораду, мераючы ручаіны сваімі чаравікамі, ён доўга тлумачыў мне, што калі валуну не зрабіць дашка, хаця б якой стрэшкі, каб ратаваць ад вады, дык ён загіне. Лепш, казаў ён, зрабіць над каменем якое-кольвечы збудаваньне, што дазволіла б падтрымоўваць вакол помніка прыроды і культуры стабільны тэмпэратурны рэжым. Вада, мароз, сонца, вільгаць скарачаюць жыцьцё каменя.

А што тады казаць пра нас, сьмяротных?

Кожны з далучаных да беларушчыны хоча пабачыць у Полацку нешта сваё, добра вядомае, зразумелае і чаканае. Знайсьці ілюстрацыі да ўласнага ўяўленьня аб зыходным, аб пачатку. Нехта называе горад сталіцай Крывіі, нехта калыскай беларускага ўніяцтва, нехта, згадваючы „прывілей“ Усяслава Чарадзея, — апошнім прытулкам паганства, нехта — галоўным месцам паломніцтва для беларусаў, маючы на ўвазе месца спачыну патронкі Беларусі, сьвятой Эўфрасіньні, нехта — сталіцаю беларускага духу, легендаў, мітаў і эзатэрыкі.

Паэт Юры Гумянюк шмат разоў быў у Полацку, але ўдвух паблукаць па горадзе нам давялося толькі сёлета ў жніўні. Я вырашыў паказаць яму, шчыраму гарадзенскаму каталіку, касьцёл, які ў сярэдзіне 90-ых паўстаў у Задзьвіньні на месцы кінатэатру „Юбілейны“. Будынак кінатэатру быў перабудаваны ў храм божы. Перш чым патрапіць у сярэдзіну касьцёла, я запытаўся ў гаспадароў дазволу. Малады ксёндз Чайкоўскі папярэдзіў, што ў сьвятыні ідзе прыборка, таму аглядаць яе будзе не зусім зручна — шмат пылу. Мы ўсё адно зайшлі. Днём тут нешта рабілі будаўнікі, а цяпер жанчыны прыбіралі друз. Вечаровыя промні, што ўрываліся ў храм праз вокны з заходняга боку, пераліваліся ў стаўпах пылу. Мы ўважліва агледзелі чатыры фрэскі, што нядаўна скончыў маляваць Уладзімер Кандрусевіч, сын вядомага кампазытара. Я сам бачыў гэтыя працы ўпершыню. Па шчырасьці, яны ня вельмі мяне ўразілі. Засучасныя, нібыта проста вялікія карціны на рэлігійную тэматыку. У іх адсутнічае нейкае сымбалічнае абагульненьне, нейкая хрэстаматыйная мэтафарычнасьць, якую заўжды заўважаеш у старажытных фрэсках. Праўда, я магу й памыляцца. Магчыма, праз нейкі час гэтыя фрэскі будуць сярод галоўных славутасьцяў Полацку. Чаму не? Інакш не

было б разьвіцьця. Людзі нечага б дасягнулі, а далей — сьцяна. Але немагчымага не бывае. Усё магчыма. Галоўнае — імкнуцца, верыць і ўпарта працаваць.

Затым, для кантрасту, я паказаў Гуменюку рэшткі бэрнардынскага касьцёла, што ў поўным занядбаньні ўсё яшчэ глядзяць на сьвет божы ля плоту псыхіятрычнай лякарні. Гумянюк прапанаваў сфатаграфаваць яго на тле тых руінаў, але раптам з розных кутоў выскачылі тры дварнякі і так агрэсыўна пачалі на нас брахаць, што мы хутка рэтыраваліся.

За вячэраю Юры дзяліўся ўражаньнямі. Больш за ўсё яго зьдзівіла тое, што ў Полацку ня носяць модных мужчынскіх туфляў з тупымі насамі. „У Горадні моладзь толькі ў такіх і ходзіць“, — патлумачыў паэт-постмадэрніст, аўтар незабыўнага верша „Я камуністам шлю вітаньне“.

Гумянюк уяўляе Полацак іншым: з матэлямі, шыкоўнымі кавярнямі, прыгожымі, вясёлымі жыхарамі, нэонавай рэклямаю, мадэрновымі будынкамі са шкла і бэтону. „Там процьма людзей, самаходаў і супэрсучасны дызайн (...) А тут — беларускі камбайн.“
Неадпаведнасьць, так бы мовіць, уяўленьню-жаданьню.

Усе мае ўражаньні ад Полацку — як аскепкі нейкага вялікага малюнку, можна разглядзець толькі фрагмэнты, кавалачкі, якіх шмат-шмат — дзясяткі, сотні, тысячы, — бывае, самы дробны і нязначны трывала кружляе ў мазгох. А нешта гістарычнае прыходзіцца зь цяжкасьцю прыгадваць-узнаўляць.

Тры гады таму на Дзяды позна ўвечары, калі людзі павярталіся з працы, я езьдзіў з уніятамі да крыжа ў Бельчыцы. Гэты вялікі мэталёвы крыж уніяты ўсталявалі на месцы масавых забойстваў палачан у часы сталінскага тэрору. У кожнай беларускай мясьціны ёсьць свае Курапаты. Было халодна, ішоў дробны дождж. Сьвечкі ўвесь час задзьмухваў моцны вецер. Традыцыйна, напрыканцы набажэнства, супольна прачыталі малітву за беларускі народ. У Бельчыцы нас прывёз на ўніяцкім аўтобусіку Мікола Шарах, старшыня полацкай грэка-каталіцкай суполкі. Мне закарцела адведаць нейкую канкрэтную магілу. Да каго? Пачаў узгадваць. Ё-маё, нават магіл не засталося ў спадчыну. Адзінае, што згадаў, — Янка Журба, пахаваны на Ксавэраўскіх могілках. Едзем на Ксавэрыю. Міхась Баўтовіч пры сьвятле месяца хутка адшукаў патрэбную магілу. Запалілі й паставілі ля пліты з імем сьвечку. Прачыталі малітву. Сьвечка, на

дзіва, ня гасла — здаецца, ужо не гарыць, але празь нейкі міг агеньчык зноў бярэцца на поўную сілу... Гэты позьні вечар на могілках помніцца выразна.

Іван Івашын выбраў сабе пакутны псэўданім і, як таго патрабуе клясычны беларускі лёс, зьведаў шмат журботных хвілінаў, асабліва пры бальшавіках. Апошнія свае гады ён дажываў у Полацку сьляпым і ў страшэннай галечы. У Саюзе пісьменьнікаў пра Журбу згадалі напярэдадні яго 80-годзьдзя. Вырашылі павіншаваць дзядзьку Янку. Прадстаўнічая пісьменьніцкая дэлегацыя прыляцела самалётам у Полацак (падзеі адбываліся ў сакавіку 1961 году). Урачыстасьць, аднак, прыйшлося адмяніць. Журба за колькі дзён да юбілею моцна абпаліў сабе твар керагазам, ляжаў у больніцы. Пісьменьнікі гэтым жа рэйсам адляцелі назад у сталіцу.

Уладзімер Арлоў у кнізе „Таямніцы полацкай гісторыі“ некалькі старонак адвёў пад расповед пра лёс полацкага ўніяцкага мітрапаліта Фларыяна Грабніцкага. Менавіта дзякуючы яго клопату ў 1750 годзе быў адбудаваны Сафійскі сабор (пасьля таго як храм у 1710 годзе ўзарвалі расейцы), праўда, адбудаваны ён быў у іншым выглядзе — у

стылі віленскага барока. Але толькі за аднаўленьне галоўнай полацкай бажніцы палачане мусілі б шанаваць імя Грабніцкага. Памяць жа аб ім у Полацку вельмі хутка зьнікла, адразу ж па ліквідацыі ў Беларусі Уніі. Прычым у ХХ стагодзьдзі лёс двойчы вяртаў магілу Грабніцкага палачанам. Пра першы выпадак падрабязна напісана ў арлоўскай кнізе. У 1913 годзе прах мітрапаліта быў знойдзены ў сьцяне царквы сьвятой Сафіі. Усё, што было каштоўнага ў пахаваньні высокай духоўнай асобы, камісія, створаная з нагоды гэтага выпадку на чале з гісторыкам Аляксеем Сапуновым, забрала, а прах вярнула на ранейшае месца. Другі раз на парэшткі Грабніцкага натрапілі ў 1972 годзе — будаўнікі мацавалі ў храме батарэі ацяпленьня. (Пра гэтую гісторыю Арлоў чамусьці не напісаў у „Таямніцах“.) Прах мітрапаліта зноў патурбавалі. Гэтым разам Грабніцкага ніхто не зьбіраўся вяртаць у сьцяну царквы, якую ён жа й пабудаваў. Чалавека проста выкінулі з уласнага дому. Тое, што ўяўляла хоць нейкую каштоўнасьць, напрыклад, рэшткі мантыі і частку праху (напрыклад, фалянгі ў пальчатках), забралі ў фонд краязнаўчага музэю, а вялікія косткі закапалі ў зямлю. Хто закапаў і дзе, я даведацца ня здолеў. Можа хто і ведае, пэўна ж — ведае, але не прызнаецца. Я ж дачуўся

пра іншае: сёньняшнія полацкія ўніяты, гадоў пяць таму, забралі з фондаў Полацкага музэю-запаведніка ўсё тое, што засталося ад праху мітрапаліта Грабніцкага. Як паўнаўладныя спадкаемцы. Цяпер рэліквія захоўваецца ў царкве сьвятой Параскевы Полацкай. Уніяты сцьвярджаюць, што прыйдзе час, і мітрапаліт вернецца ў Сафійскі храм.

Паспрабуйце ўявіць які-небудзь больш-менш значны польскі касьцёл без мэмарыяльных плітаў і магілаў вядомых палякаў. Уявіць цяжка. Да чаго падобны Сафійскі сабор бяз гэтых лёсаў-рысак на скрыжалях айчыннай гісторыі? Абрабаваны храм!

Часта перачытваю разьдзел „Полацак“ з кнігі Яна Баршчэўскага „Шляхціц Завальня“, якую пераклаў з польскай Мікола Хаўстовіч. Пачатак памятаю, як верш: „Мінаю пушчы і вось на шырокай раўніне бачу горад Полацак. Званы сьв. Стафана, на замкавай гары — царква сьв. Сафіі, якія, стоячы ў тумане, здаецца, імкнуцца да воблакаў; іх постаці-веліканы пануюць над горадам і над усёй ваколіцай...“ Рэдагуючы рукапіс, выдавец кнігі Рамуальд Падбярэскі ня вытрымаў і дапісаў: „Калі выпраўляў карэктуру гэтага аркуша, міжволі апанавалі мяне пачуцьці. Думкі мае, акрыленыя ўспамінамі, імчаць да

празрыстых вод Палаты. Памятаю грандыёзныя купалы гораду, які магу назваць родным; сьціплую дахоўку сьвятога для мяне будынка (езуіцкага калегіюму. — А.А.), яго доўгія калідоры і прыцемак сьвечак у вялікім касьцёле…“

Каб так палюбіць Полацак, не абавязкова быць сэнтымэнтальным.

Маё ўлюбёнае месца для шпацыраў — поплаў ля Палаты, якая абгінае ніжні і верхні замкі. Мне здаецца, што я беспамылкова магу пазнаць, дзе раней стаялі млыны на рэчцы, дзе былі масткі ў горад. Тут неверагодна маляўнічыя краявіды, зь нейкай боскай ціхай прыгажосьцю. Можна залезьці ў раку, каб адчуць босымі нагамі яе спрыт і энэргію. Вада ў Палаце бяжыць хутка, нават цяжка трымаць раўнавагу. Нахіляешся і дастаеш з вады цагліну — клясычная плінфа, з такіх цаглінаў будавалі ў Полацку ў X–XIII стст. Шкада выкідаць — панясу дамоў, падару каму-небудзь з гасьцей. (Вітаўту Чаропку было дазволена на маім гаўбцы выбраць любую — спыніўся на самай вялікай, ледзь улезла ў партфэль. Задаволены, павёз цагліну ў Менск — часьцінку сапраўднага Полацку.)

На мінулым тыдні ў госьці завіталі Пятро Васючэнка зь сямейнікамі — Пятро прыехаў

на гадавіны па бацьку. Яго жонка, археоляг Ніна Здановіч, бадай, лепшы спэцыяліст па беларускай кераміцы і кафлі, неаднойчы дасьледавала Полацак. Паказаў ёй свае знаходкі. Сярод рознага „мэталалому“ чаго яна толькі не ідэнтыфікавала. Але найбольш мяне ўразіла „апазнаньне“ маёй апошняй знаходкі — Ніна ўзяла ў рукі чарговую жалезіну і кажа: „А вось гэта звычайная шпора, прычым старая, як мінімум стагодзьдзе дванаццатае-трынаццатае“. Прызнацца, калі я яе знайшоў, амаль ля самага майго пад’езду, побач са школьным футбольным полем, я падумаў, што гэта нейкі кочат. Але ўсё адно забраў дахаты. Гэтую жалезку да мяне, напэўна, бачылі дзясяткі людзей.

Гэтак жа няпроста ўбачыць Полацак.

*2000 г.*

## Полацак жывы літаратурай

Развой літаратурнага жыцьця на Полаччыне ў 20-х гадах XX стагоддзя беларускія літаратуразнаўцы слушна зьвязваюць з утварэньнем у старажытным горадзе акруговай філіі ўсебеларускага літаратурнага аб'яд-наньня "Маладняк". Крыніцы, якія сьведчаць пра тыя па-дзеі, аднадушна, без ніякай блытаніны, паведамляюць: філію заснаваў малады паэт Алесь Дудар, якому на той час было ўсяго 20 гадоў...

Варта крыху спыніцца на гэтай постаці. У Полацк Дудар прыехаў ня проста летуценным юнаком, які піша вершы, – ён на той час ужо зьяўляўся адным з заснавальнікаў літаратурнай арганізацыі "Маладняк" (была ўтвораная ў 1923 годзе). Друкавацца Дудар пачаў з 1921 году, гэта значыць, з сямнаццацігадовага ўзросту. На пачатку сваёй літаратурнай дзейнасьці друкаваўся пераважна ў газеце "Савецкая Беларусь", з якой доўгі час супрацоўнічаў. Большасьць літаратуразнаўчых крыніцаў паведамляе, што "галоўным ініцыятарам стварэньня арганізацыі (...) быў М.Чарот". Гэты не зусім дакладны факт быў прыдуманы савецкімі літаратуразнаўцамі, а затым патрапіў у постсавецкія літаратуразнаўчыя крыніцы.

Міхась Чарот сапраўды быў адным з самых аўтарытэтных лідэраў "Маладняку", але ініцыятарам стварэньня гэтай літаратурнай суполкі ён ня быў. Вось як апісвае паўставаньне "Маладняку" Дудар у сваіх успамінах-пакаяньні, якія ён пісаў у турме НКВД: "У 1923 годзе нейкі Беларусаў, які хварэў на пісьменьніка, рабіў спробы стварыць пісьменьніцкую арганізацыю. З гэтых спробаў нічога не выходзіла, бо ў яго не было пэўнага крытэрыя ў падборы сяброў гэткае арганізацыі. Сходы, якія скліkaліся ім, ні да чаго не прыводзілі, і пасьля аднаго з такіх сходаў мы з Александровічам парашылі плюнуць на іх і ўзяцца за заснаваньне арганізацыі маладых пісьменьнікаў, якія к таму часу больш саветызаваліся. Мы пагаварылі аб гэтым з Вольным, і вынікам гэтага зьявілася заснаваньне групы, а пасьля і аб'яднаньня "Маладняк".

Такім чынам, можна сьцьвярджаць, што менавіта Алесь Дудар разам з Андрэем Александровічам быў галоўным ініцыятарам утварэньня літаратурнай арганізацыі "Маладняк". Праўда, юныя творцы ў той час цьмяна ўяўлялі, што далей рабіць са сваёй суполкай, таму блізу году яна існавала фармальна. Дудар прызнаецца, што ў 1924 годзе "арганізацыя на ладан дыхала". Якраз у

гэты час нявызначанасьці і няпэўнасьці для маладога паэта загадчык агітацыйна-прапагандысцкага аддзелу Віцебскага акругкаму Аляксандр Сянкевіч запрашае Дудара прыехаць у Віцебск дзеля працы ў гарадской газеце. Вось як гэты ад’езд са сталіцы ў правінцыю апісвае сам Дудар: “У Віцебск паехаў я з ахвотаю, і Сянкевіч быў першым, з кім я пачаў гутарку аб заснаваньні Віцебскай філіі “Маладняку”. Такая філія і была мною заснавана ў складзе: мяне, Сянкевіча і Мазуркевіча. Пазьней да філіі далучыўся Касьпяровіч, які ў той час там працаваў”.

Падобна на тое, што Дудар разглядаў сваю паездку ў Віцебск як адмысловую камандзіроўку ад “Маладняка”. Уласна нацыянальных пісьменьніцкіх кадраў Дудар у Віцебску не знайшоў. Сянкевіч быў грамадска-палітычным дзеячам, Мазуркевіч – настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, Касьпяровіч – супрацоўнікам Віцебскага акруговага аддзелу народнай асьветы. Гэта былі тыя людзі, якія непасрэдна займаліся ў Віцебску праблемай беларусізацыі. Ніхто з іх стала літаратурнай дзейнасьцю не займаўся. Пазьней, калі ў Беларусі пачаўся жах-лівы генацыд у дачыненьні да беларускай

інтэлігенцыі, усе гэтыя першыя віцебскія маладнякоўцы былі рэпрэсаваныя.

Дудар працаваў у Віцебску непрацяглы час. Праз месяц ён пераехаў у Полацк. Ці тое адбылося з яго ўласнай ініцыятывы, ці яго накіравалі на дапамогу ў справе беларусізацыі старажытнага гораду – нам гэта невядома. У сваіх успамінах-пакаяньні Дудар піша: “Пасьля месячнай працы ў Віцебску я пераехаў у Полацак, дзе быў прыняты ў камсамол. ЦБ “Маладняку” наказала мне заснаваць і там філію, але тут я спаткаўся з фактам поўнай адсутнасьці літэратурных сілаў на Полаччыне. Дзеля гэтага я, нягледзячы на напамінаньні ЦБ, доўгі час нічога не рабіў, аж пакуль не прыехалі Вольны і Пушча і не патлумачылі мне, што пры адсутнасьці літаратурных сілаў можна абмежавацца падборам людзей, якія разьбіраліся б добра ў літаратуры, былі б добрымі яе папулярызатарамі і магчыма ў будучыні вылучылі б з сябе літаратурных крытыкаў і наогул літаратуразнаўцаў. Выходзячы з гэтага прынцыпу, я заснаваў Полацкую філію “Маладняку”, у якую ўваходзіла чалавек 7, з якіх я адзін меў дачыненьне да літаратуры; рэшта былі маладыя настаўнікі, скончыўшыя Менскі педтэхнікум, пара вучняў і ўсё”.

У газеце “Полоцкий пахарь” Дудар працаваў да жніўня 1925 году, пасьля чаго вярнуўся ў Менск. На той час літаратурнае аб’яднаньне “Маладняк” ужо самае галоўнае, – маладнякоўцы дамагліся дзяржаўнага фінансаваньня. З траўня 1925 году літаратурная арганізацыя “Маладняк” пачала выдаваць кнігі. У гэтым спрыяльным для “Маладняка” годзе ў Дудара выходзіць адразу два зборнікі вершаў “Беларусь бунтарская” і “Сонечнымі сьцежкамі”. Значную частку гэтых кніг склалі вершы, якія паэт напісаў або ў самім Полацку, або паводле ўспамі-наў жыцьця ў старажытным горадзе. Сярод іх верш “Скарына”, у якім камсамольскі паэт Дудар услаўляў славутага палачаніна за тое, што ён “аправіў мужычую мову ў неўміручы гнуткі пергамент”.

Зерне, кінутае Дударом у полацкую глебу, шчодра ўскаласілася. Полацкая філія “Маладняку” пачала хутка расьці. Шмат якія маладыя паэты з усёй Беларусі імкнуліся прыехаць і пажыць у старажытнай сталіцы крывічоў. Дудар у сваіх прымусовых мемуарах піша: “У лютым 1926 году, калі Адамовіч (маецца на ўвазе Алесь Адамовіч – партыйны дзеяч 20-х гадоў і актыўны прыхільнік працэсу беларусізацыі. – А.А.) быў назначаны сэкратаром Полацкага акругкаму

КП(б)Б, ён пачаў падбіраць туды “сваіх людзей”, г.зн. работнікаў даволі надзейных з пункту погляду “беларускасьці”. Выехаў туды Александровіч, зьбіраўся ехаць і я, але не паехаў, бо ЦБ “Маладняку” пастанавіла пакінуць мяне на працы ў апараце ЦБ літаратурным сакратаром (адказным сакратаром ЦБ застаўся тады Вольны). Замест мяне паехалі Звонак і Дубовік, якія прайшлі там моцную нацыяналістычную школу пад уплывам Александровіча. (…) Там жа ў Полаччыне працаваў Хурсік, які яшчэ ў Менскім тэхнікуме праяўляў нацыяналістычныя настроі. Тую ж школу прайшлі Броўка, Шалаяў, Відук, Шукайла – усе яны працавалі ў Полаччыне (…)”.

Што ж гэта за нацыяналістычныя настроі, якімі набрыньвалі на Полаччыне маладыя літаратары? Адказ на гэтае пытаньне можна знайсьці ва ўспамінах Алеся Звонака пра Валерыя Маракова. Абодва гэтыя паэты мелі гонар пажыць і па-працаваць у Полацку. Вось як апісвае гэты час Звонак: “Была яшчэ адна характэрная асаблівасьць “Маладняку” – гэта яго масавасьць, адсутнасьць замкнутасьці, чым пазьней характарызаваліся такія літаратурныя аб’яднаньні, як “Полымя” і “Узвышша”, яго ня толькі літаратурная, але і шырокая асьветніцкая, папулярызатарская

дзейнасьць. Маладнякоўцы ўсталёўваліся ў тагачасных акруговых цэнтрах на сталую працу, узначальвалі так званыя акруговыя філіі “Маладняку”, арганізоўвалі друкаваныя выданьні (часопісы, альманахі, зборнікі). Так апынуўся ў 1925 годзе і я ў старажытным Полацку, дзе зьмяніў Александровіча, які быў прызначаны рэдактарам Клімавіцкай акруговай газеты “Наш працаўнік”. Прыехаўшы па нейкіх рэдакцыйных справах у Менск, я сустрэў Валерыя Маракова. Быў ён бяз пэўных заняткаў, пакрысе друкаваўся, рыхтаваў да друку другую сваю кніжку паэзіі “На залатым пакосе”, матэрыяльна быў не забясьпечаны, вяртацца на бацькаўскую мулярку не хацелася, прывязваў тэхні-кум… Ня трэба забывацца на тое, што ў тыя гады існавала беспрацоўе. Я за-прасіў Маракова прыехаць часова ў Полацк, папрацаваць, падправіць сваё матэрыяльнае становішча.

Неўзабаве ён прыехаў у Полацк. Тады Полацк і шэраг раёнаў Віцебшчыны былі далучаныя да БССР, установы ўсе пераводзіліся на дзяржаўную мову Беларусі, ствараліся амаль пры кожнай установе гурткі па вывучэньні беларускай мовы. Вось тут Маракову была неабмежаваная педагагічная практыка як студэнту Менскага белпедтэхнікуму.

Працэс гэты называўся тады афіцыйна словам “беларусізацыя” і выклікаў даволі актыўнае пярэчаньне старой часткі царскай чыноўнай інтэлігенцыі, якая засталася ад старых часоў у павятовым горадзе Полацку. Не абышлося і без кур’ёзаў. Мне і выкладчыку Полацкага педтэхнікуму маладнякоўцу Грашчанку камгас вылучыў жыльлёвае памяшканьне ў былой цырульні. Абсталяваўшы яе тэхнікумаўскімі тапчанамі і табурэткамі, змайстраваўшы з нейкіх скрынак стол, мы зажылі самастойна і незалежна ў камгаснай кватэры. Была, праўда, і маленькая нязручнасьць. Уваход быў з вуліцы, і многія жыхары з горада, а таксама прыезджыя з раёнаў па старой памяці з размаху адчынялі дзьверы і пыталіся: “Пастрыгчыся можна? Пагаліцца можна?” На што мы цярпліва адказвалі, што цырульня не працуе, зачыненая і г.д. Вось тут мы і пасялілі В. Маракова. У “цырульню” прыходзілі толькі начаваць. На дзьвярах вешалі паперку “Цырульня зачыненая на рамонт”. А ўвесь вольны час праводзілі ў рэдакцыі, там і “тварылі”. А самым любімым нашым заняткам былі начныя блуканьні па берагах чароўнай Заходняй Дзьвіны, на якой у туманнай далечыні мільгацелі агеньчыкі на плытах, што з парыпваньнем і ўсплёскамі ціха праплывалі міма сівых муроў старажытнага Полацку ў

замежную тады Латвію… Любілі пахаджаць і па абса-джанаму клёнамі і бярозамі валу Івана Грознага, што ўзвышаўся над Стралецкай Слабадою зялёным паўкругам… Часцяком наведвалі славутую Сафійскую горку на лукавіне паміж маленькай Палатой і магутнай Дзьвіной… І міжвольна ў нашых юнацкіх сэрцах абуджалася шчымлівае салодкае пачуцьцё гонару за сваю дзяржаву Беларусь, за яе шматпакутную, замешаную на крыві і сьлязах гісторыю, за яе сьветлую будучыню, у стварэньні якой ёсьць і наш сьціплы ўдзел… Пазьней гэта ўсё называлася “нацдэмаўшчынай”, праявамі “буржуазнага нацыя-налізму”, “арыентацыяй на захад”, карацей кажучы, контррэвалюцыяй, а за ўсе гэтыя хадзячыя ярлыкі трэба было пазьней плаціць або жыцьцём, або “вандраваньнем па пакутах” у далёкіх сіберных краях (…)”.

У адрозьненьне ад Валерыя Маракова, Алесь Звонак жыў і працаваў у Полацку больш працяглы час – з 1925 па 1927 год. У 1926 годзе паэт напісаў цыкл вершаў “Полаччына”.

Галоўнымі культурнымі цэнтрамі ў Полацку, як таму і належала быць, сталі моладзевыя асяродкі педтэхнікуму і ляснога тэхнікуму. Менавіта са студэнтаў гэтых навучальных установаў полацкая філія “Маладняку”

актыўна пашырала кола сваіх сяброў. Выпускнік 1930 году Полацкага педтэхнікуму пісьменнік Генрых Героднік у сваіх успамінах, якія ён напісаў у 1972 годзе, згадвае: “Многие увлекались поэзией, литературой. И не только платонически – пробовали свои силы, состояли в литературном объединении “Маладняк” или мечтали стать маладняковцами. В моей учебной группе маладняковцами были Сымон Лесничий, Язэп Козик, Лында, Тарас Хадкевич. Много читала и глубоко изучала литературу Нина Войтович. Сейчас Тарас Хадкевич – известный белорусский писатель, Нина Войтович – доктор филологических наук, фольклорист”.

Студэнты арганізоўвалі свае ўласныя літаратурныя вечарыны, а таксама наладжвалі сустрэчы з вядомымі сталічнымі паэтамі і празаікамі. Вялікія агульнагарадскія сустрэчы прайшлі 21 чэрвеня 1925 года, 11 траўня, 28 лістапада 1926 году, 24 сакавіка 1927 году з удзелам Янкі Купалы, Міхася Чарота, Змітрака Бядулі і шматлікіх маладнякоўцаў. Вечарыны з удзелам полацкіх маладнякоўцаў ладзіліся ледзь не штотыдзень. Вось што згадвае ў сваіх успамінах выпускнік Полацкага лясного тэхнікуму 1927 году А. Пажарскі: “В техникуме проводилась большая общественная, спортивная и культурно-

массовая работа. На наших вечерах частым гостем был Петрусь Бровка, работавший в то время в газетах "Чырвоная Полаччына" и "Полоцкий пахарь" и уже писавший стихи. Вечера с его участием проходили живо, интересно и с большой пользой для нас. Среди студентов были и свои писатели, и поэты. Например, пьесы, написанные студентом Дашковым, и стихи студента Дождева использовались самодеятельностью на сцене техникума. Многие из нас писали в полоцкую газету, выпускали свои стенные газеты (...)".

Аднак, безумоўна, галоўным цэнтрам літаратурнага жыцьця тагачаснага Полацку зьяўлялася газета "Чырвоная Полаччына" (рускамоўная газета "По праіснавала ўсяго з 1924 па 1926 год, у 26-ым яна перайшла на беларускую мову і пачала называцца "Чырвоная Полаччына"). У гэтай зьмене немалую ролю адыгралі маладнякоўцы, якія практычна выдавалі яе ўласнымі творчымі сіламі. Напрыклад, у 1926 годзе ў "Чырвонай Полаччыне" працавалі выключна маладнякоўцы. Вось як гэта згадвае тагачасны рэдактар і маладняковец Сьцяпан Сямашка: "Я пачынаў спрабаваць свае літаратурныя сілы яшчэ ў Чырвонай Арміі ў час грамадзянскай вайны. Вярнуўшыся ў 1921 г. з арміі, пачаў друкаваць свае заметкі

спачатку ў “Полоцком пахаре”, а затым у “Чырвонай Полаччыне”.

Увосень 1926 г. Полацкі акруговы камітэт партыі прызначыў мяне рэдактарам газеты “Чырвоная Полаччына”. Страшнавата было. Пісаць нататкі і артыкулы зусім ня тое, што кіраваць газетай, тым больш ня маючы сьпецыяльнай журналісцкай адукацыі. Прыйшлося і працаваць у газеце, і займацца самаадукацыяй у галіне газетнай справы.

Газета выходзіла 4 разы на тыдзень, але вялікім фарматам, і таму нямала патрэбна было матэрыялу, каб запоўніць 4 паласы. Штат жа рэдакцыі быў невялікі – усяго 4 чалавекі разам з рэдактарам. Аддзелаў у рэдакцыі не было. Праца была разьмеркавана наступным чынам: рэдактар, апрача агульнага кіраўніцтва, пісаў перадавыя, падбіраў і апрацоўваў матэрыялы ў партыйны аддзел газеты; сакратар рэдакцыі Пятрусь Броўка падбіраў і апрацоўваў матэрыялы рабочай і сялянскай моладзі, вёў перапіску з рабселькарамі; астатнія 2 таварышы – Тарас Хадкевіч і Янка Скрыган – лічыліся літработнікамі і выконвалі ўсе даручэньні рэдактара і сакратара, апрацоўвалі матэрыялы, выконвалі абавязкі рэпарцёраў у горадзе. Газета мела ў той час каля 200

актыўных рабкараў і селькараў, з якімі рэдакцыя трымала пастаянную сувязь. З ліку лепшых рабселькараў асобныя таварышы залічваліся на работу ў рэдакцыю. Так было са Сьпірыдонам Міхальцовым і Эдуардам Самуйлёнкам. Вакол газеты групаваліся маладыя сілы Полаччыны".

У розныя часы сябрамі Полацкай філіі "Маладняку" былі: Алесь Дудар, Андрэй Александровіч, Пятрусь Броўка, Алесь Звонак, Валеры Маракоў, Эдуард Самуйлёнак, Ян Скрыган, Сьцяпан Сямашка, Паўлюк Шукайла, Тарас Хадкевіч, Сымон Хурсік, Ганна Брэская, Язэп Козік, М.Грашчанка, П.Крывіцкі, С.Мілевіч, Я.Падабед, К.Пчалкоў, Р.Хвойка (Пугач) і шматлікія іншыя маладыя творцы.

Пасьля ад'езду з Полацку Дудара, кіраўнікам мясцовай філіі "Маладняку" стаў Алесь Звонак, які замяніў Александровіча ў полацкай газеце. У 1926 годзе на чале полацкіх маладнякоўцаў стаў Сьцяпан Сямашка, затым – Сымон Хурсік, а з сакавіка 1928 году да ліквідаваньня "Маладняку", якое адбылося ў лістапа-дзе 1928 году, філію ачольваў Тарас Хадкевіч.

У Полацкую філію "Маладняку" ўваходзілі ня толькі жыхары Полацку, але і моладзь з

навакольных мястэчак і вёсак. Так Сымон Хурсік пасьля сканчэньня Менскага педтэхнікуму настаўнічаў у мястэчку Валынцы і зьяўляўся актыўным сябрам Полацкай філіі "Маладняку", праўда, неўзабаве ён пераехаў у Полацк і пачаў працаваць у "Чырвонай Полаччыне" і нават нейкі час узначальваў полацкі "Маладняк".

Ян Скрыган і Паўлюк Шукайла працавалі ў Расонах і таксама хінуліся да полацкіх маладнякоўцаў. Ян Скрыган у сваёй аўтабіяграфічнай аповесьці "Кругі" наступным чынам апісвае тыя часы: "Неўзабаве я пераехаў на работу ў "Чырвоную Полаччыну" (маецца на ўвазе, з Расонаў. – А.А.). Горад, газета, зноў друкарскія фарбы – гэта было больш па душы. Дый рэдактарам быў найдабрэйшы чалавек – Сьцяпан Сямашка. А сакратаром рэдакцыі – Пятрусь Броўка. (...).

Найбольш мы любілі Сямашку, мабыць, за тое, што ён нам верыў. Мы рабілі газету з нейкім сьвятым адчуваньнем. Броўка пісаў вершы. Простыя, даступныя, і мне было шкода, што я ад гэтага адступіўся (маецца на ўвазе, кінуў пісаць вершы. – А.А.). Вакол газеты гуртаваўся літаратурны актыў. У Валынцах настаўнічаў Сымон Хурсік, ён ужо

быў вядомы пісьменьнік, меў кніжку ў маладнякоўскім выданьні – “Першы паўстанак”, і калі прыязджаў, то мы бачылі ў ім старэйшага. Да нас час ад часу наязджалі з Менску – Андрэй Александровіч, Алесь Дудар, Анатоль Вольны. Наставала патрэба выдаваць свой альманах. Разам з менскімі пісьменьнікамі выдалі два альманахі: “Наддзьвіньне” і “Росквіт”.

Насамрэч полацкія маладнякоўцы выдалі тры літаратурныя альманахі: у 1926-м годзе “Наддзьвіньне”, у 1927-м – “Росквіт”, у 1928-м – “Зарніцы”. Акрамя таго вершы і проза палачанаў шырока друкаваліся ў газеце “Чырвоная Полаччына” і цэнтральных беларускіх выданьнях.

Пасьля ліквідаваньня літаратурнага аб’яднаньня “Маладняк”, традыцыі, створаныя маладнякоўцамі, жывілі культурнае жыцьцё Полацку, бадай, да самага пачатку другой сусьветнай вайны. Выпускніца Полацкага педтэхнікуму 1935 году літаратурны крытык Марыя Барсток у сваіх успамінах, якія напісала ў 1972 годзе па просьбе дырэктара Полацкага педвучылішча Пятра Пацэя, згадвала: “Быў у нас і літгурток, якім кіраваў У.С. Шчасны (дарэчы, бацька вядомай мастачкі Нінэль Шчаснай. – А.А.).

Стараста гуртка – Тэрэнт Лясовіч пісаў добрыя вершы і супрацоўнічаў у газеце “Чырвоная Полаччына”. Хадзіў да нас у гурток і Рыгор Канавалаў (цяпер старшыня камітэта па друку), хаця ён вучыўся ў лясным тэхнікуме. На вялікі жаль, Т.Лясовіч загінуў у час вайны, так і не пасьпеўшы выпусьціць свой першы зборнік. У Полацку ў свой час працавалі П.Броўка, Э.Самуйлёнак, там былі філіі “Маладняку”, і дух літаратуры, паэзіі вітаў над намі”.

На жаль, ня ўсе маладыя творцы, якія пачыналі літаратурную дзейнасьць у полацкіх літаратурных суполках, адбыліся як літаратары. Частка з іх спыніла сваю літаратурную дзейнасьць па волі жыцьцёвых абста-вінаў, частка полацкіх маладых літаратараў загінула ў віхуры другой сусьветнай вайны, частка патрапіла пад рэпрэсіі, або спыніла літаратурную дзейнасьць з-за страху перад рэпрэсіямі. Шмат хто з гэтых юнакоў і дзяўчат, актывістаў полацкіх літаратурных суполак, былі насамрэч здольнымі творцамі. Вось як Марыя Барсток у 1972 годзе пісала пра Тэрэнта Лясовіча ў прыватным лісьце да дырэктара Полацкага педвучылішча Пятра Пацэя: “У нас быў літгурток. Ім кіраваў І.С. Шчасны. Старастам гуртка быў Тэрэнт

Лясовіч. Т. Лясовіч загінуў у час вайны. Пакольві ён ня быў членам Саюза пісьменьнікаў, то ў даведніках няма нічога аб ім. А між тым, гэта быў добры паэт. Можа Вы знойдзеце яго родных, членаў сям'і, фота і зьвесткі аб ім, тады можна будзе ставіць пытаньне аб занясеньні яго імя на Дошку (маецца на ўвазе мемарыяльная дошка з імёнамі беларускіх пісьменьні-каў, якія загінулі падчас другой сусьветнай вайны, гэтая дошка знаходзіцца ў Доме літаратараў. – А.А.) і ўключэньні ў даведнік". На жаль, гэтая задума не была рэалізаваная.

Сёньня прысьпеў час вярнуць асобныя імёны полацкіх літаратараў 1920-30 гадоў у беларускую літаратуру. Першай ластаўкай у гэтым кірунку стаў выхад паэтычнага зборніка Ганны Брэскай "Настурцыі", які пабачыў сьвет у серыі "Бібліятэка часопіса "Калосьсе" у 2000 годзе.

Сакавік, 2003 г.

## Рызыкоўная барацьба намэнклятуры

Ці можна было ўратаваць Беларусь ад сталінскага генацыду? Так, калі б яе да 1930 году ўдалося адарваць ад СССР. Беларускім нацыянал-камуністам проста не хапіла на гэта часу.

Разгром нацыянальна эліты пачаўся 17 лютага 1930 году з арышту Пятра Ільлючонка. Па справе «Саюзу вызваленьне Беларусі»* воля да супраціву была зломленая. Пасьля 17 лютага будуць толькі арыштоўваць і арыштоўваць. Межы закрыліся, абцугі сьціснуліся, машына дэзінфармацыі будзе працаваць гэтаксама эфэктыўна, як машына масавага забойства. У Курапаты паедуць камуністычныя душагубкі, у Варкуту — цягнікі. А ахвяры, нібы калярадзкія жукі ў вядры, падзеляцца на тых, хто пакорліва чакае выраку на дне, і тых, хто вылазіць па галовах братоў, як многія будучыя народныя паэты і акадэмікі. Сталіністы сьвядома і мэтанакіравана выбівалі самых энэргічных, самых адукаваных, самых-самых... Беларусь страціла 200 тысячаў жыцьцяў.

У позьнесавецкі пэрыяд дасьледчыкі выстаўлялі «СВБ» зь яго 108-мю сябрамі прыдумкай чэкістаў.

Першай ахвярай ГПУ стаў лідэр беларускіх нацыяналістаў, акадэмік Усевалад Ігнатоўскі. Яго выклікалі ў ГПУ на допыт, пасьля якога ён застрэліўся на сваёй кватэры. ГПУ разьлічвала, што праф. Ігнатоўскі назаве асобаў нацыянальнага руху, якія ставілі задачу скіданьня ў Беларусі савецкага рэжыму, абвяшчэньня незалежнасьці і ўсталяваньня дэмакратычнага ладу. Прафэсар выбраў сьмерць. Сьмяротным ударам былі арышты наркама земляробства Зьмітра Прышчэпава, ягонага намесьніка Алеся Адамовіча і наркама асьветы Антона Баліцкага.

Асоба Алеся Адамовіча вартая асобнай кнігі. Ён пасьпеў пабыць сакратаром Калінінскага і Полацкага акруговых камітэтаў КП(б)Б, загадчыкам аддзелу друку ЦК КП(б)Б, намесьнікам наркама (намесьнікам міністра, калі браць па цяперашняй шкале) земляробства. Менавіта яму, нефармальнаму куратару «Маладняку», прысьвяціў сваю паэму «Калініншчына» Дубоўка. Адамовіч стаў прататыпам Дубоўкавага «кандуктара» з паэмы «Штурмуйце будучыні аванпосты!»,

Сьляпня ў рамане М.Зарэцкага «Крывічы», Абрама Ватасона ў рамане Кузьмы Чорнага «Сястра».

Гэта быў умелы арганізатар і пасьлядоўны праваднік нацыянальных інтарэсаў. Ён беларусізаваў усходнія ўскрайкі БССР (цэнтар Калінінскай акругі — Клімавічы) непрацяглы час, але вынік працы быў надзвычайна плённым — з краю над Бесядзьдзю і Сожам выйшла плойма маладых талентаў. Куляшоў, Астапенка і Таўбін — пачынальнікі тае славы — свае першыя публікацыі зрабілі ў альманаху «Маладняк Калініншчыны» (1926).

Большасьць скандальных фэльетонаў Вольнага, артыкулаў Дудара, Александровіча, Зарэцкага (у тым ліку пратэст супраць «небеларускага» ўнівэрсытэту) былі напісаныя на замову Адамовіча. «Куратар», раскалоўся Дудар, замаўляў яму артыкул «на ўзор валабуеўскага ў «Більшовику України», з эканамічным абаснаваньнем на¬цы¬я¬на¬лістычных тэорый Шумскага і Хвы¬лёвага. Замаўляючы, Адамовіч «мнагазначна дадаў, што аўтар артыкулу «сасланы ў Салаўкі».

Ён ведаў, чым яны рызыкавалі. Алесь Дудар на допытах у ГПУ выдаў, што Алесь Адамовіч трымаўся падкрэсьлена кансьпірацыйнага

тону гутарак. Наватвор «сачкам», ад слоў «сачыць» і «камісар», быў створаны менавіта віцэ-міністрам Адамовічам. «Сачкаманіяй» — строгай разборлівасьцю ў знаёмствах і выбары суразмоўцаў — ён заражаў і іншых.

«Слова «вождь» (на расейскай мове) было ў Адамовіча лаянкай», — кажа Дудар. З правадыроў Адамовіч зьдзекліва іранізаваў.

## На патрыятычным уздыме

Выдатныя лідэрскія і арганізацыйныя здольнасьці меў і Антон Баліцкі, адзін з самых актыўных праваднікоў палітыкі беларусізацыі ў 1920-х гадах.

У Наркамасьветы, разам з Жылуновічам і Некрашэвічам ён стварыў каапэратыўнае выдавецтва «Адраджэньне», выдаваў падручнікі. Рабілася гэта пры дапамозе Ігнатоўскага, тагачаснага наркама асьветы.

Вечарамі «на агеньчык да Баліцкага» заходзілі ня толькі Некрашэвіч, Жылуновіч, але і Кудзелька (Міхась Чарот), Прышчэпаў, іншыя ключавыя «мясцовыя кадры» апарату БССР.

У 1926 годзе на пасадзе наркама асьветы Баліцкі замяняе Ігнатоўскага. У гэтым жа годзе Інбелкульт наладжвае акадэмічную

канфэрэнцыю па рэформе беларускага правапісу. Канфэрэнцыя прайшла на эмацыйным патрыятычным уздыме, а яе арганізатары атрымалі па шапцы: на сцэне адсутнічаў партрэт Леніна, затое заля была аформлена ў нацыялістычныя колеры.

На гэты момант у БССР з 4057 чатырохгадовых школ па-беларуску выкладалі 3794 (93,5%). 1 студзеня 1927 году Ігнатоўскі вымушаны апраўдацца ў «Зьвязь¬дзе» супраць публікацый у замежным друку, дзе паведамлялася, што «народна-дэмакратычны рух накіраваны проці ўлады ў Савецкай Беларусі» і рыхтуе паўстаньне».

**Разьвязка**

Аднак беларускі ўрад быў урадам толькі напалову. Ён не кіраваў сілавымі структурамі. Масква кантралявала Менск цалкам праз сваіх «казачкоў». Як толькі Сталіну сталі без патрэбы нацыянал-камуністы з рэспублік, на якіх ён раней абапіраўся ў свай барацьбе з трацкістамі і іншымі ўхілістамі, ён пачынае разгром нацыянальных элітаў.

Гісторыя ня любіць умоўнага ладу, і тым ня менш: што магло б уратаваць Беларусь ад сталінскага генацыду? Паўстаньне, аддзяленьне, абвяшчэньне незалежнасьці?

Магчыма, паралельна з Украінай, на хвалі незадаволенасьці калектывізацыяй, голадам… Структуры, якія так старанна разбудоўвалі нацкамы, былі не гатовыя да таго. Каб яшчэ пару гадоў… Мо тады між Балтыйскім і Чорным марамі знайшліся б свае Манэргеймы, што ўратавалі б усходнеэўрапейскія народы ад крывавага памолу.

Першым, 17 лютага 1930 году, быў арыштаваны Ільлючонак. 26 чэрвеня — Смоліч. 14 ліпеня — Цьвікевіч. 17 ліпеня — Лёсік. 18 ліпеня — Алесь Адамовіч і Максім Гарэцкі. 19 ліпеня — Прышчэпаў. 20 ліпеня — Дубоўка. 21 ліпеня — Некрашэвіч і Ластоўскі. 31 жніўня 1929 г. Баліцкі вызваляецца ад пасады наркама асьветы. Яго арыштуюць праз год — 3 верасьня 1930 году. Тады сьледчыя некаторы час спрабавалі паставіць на чале «СВБ» мацёрых нацыяналістаў Ластоўскага-Цьвікевіча-Смоліча. Але нічога не ўдалося, іх уплыў у савецкай Беларусі быў невялікі — і пачалі шукаць Баліцкага.

4 лютага 1931 г. застрэліўся Ігнатоўскі, 11 красавіка 1937 г. скончыў жыцьцё самагубствам у магілёўскай псыхушцы Жылуновіч. Хто заставаўся з жывых — быў зьнішчаны ў 1937 г. Чарвякоў, адзін з

апошніх «зуброў»-нацкамаў, застрэліўся. А неўзабаве вынішчылі многіх чэкістаў-сьледчых, што вялі справу «СВБ». Каб у гісторыі не засталося сьлядоў.

**Хто кіраваў?**

Калі чытаеш апублікаваныя матэрыялы допытаў, ствараецца ўражаньне, што нейкая закансь¬піраваная арганізацыя, без фармальнага сяброўства для неўтаямнічаных сымпатыкаў, усё ж існавала.

Хто ж тады быў за кіраўніка яе? Да інтэлігентаў-«адраджэнцаў» Алесь Адамовіч адмоўна ставіўся. Дарэчы, паэма Андрэя Александровіча «Цені на сонцы», у якой паэт б’е па «нацдэмах», была напісана на замову і на фактуры Адамовіча. Старыя «адраджэнцы» разглядаліся Адамо¬вічам як каштоўныя нацыянальныя спэцыялісты. Але ненадзейныя палітыкі.

Тая арганізацыя выглядае перадусім змовай нацыянальнае намэнклятуры, што прагнула здабыцьця нацыянальнае незалежнасьці і поўнае міжнароднае суб’ектнасьці сваёй дзяржавай, спачатку хоць бы па манголь¬скім варыянце. У такім разе, Чарвякоў? Ці наркам асьветы Ба¬ліцкі?

А можа ГПУ не памылялася, і гэта быў усё ж Ігнатоўскі зь ягоным багатым вопытам падпольля — спачатку ў шэрагах эсэраў, затым у БПС-Р, і нарэшце ў Беларускай камуністычнай арганізацыі, якую ўласна Ігнатоўскі стварыў — БПС-Р «Маладая Беларусь» — і да канца ўзначальваў. Гэта пры ім БКА вяла ўзброеную партызанскую барацьбу. Праўда, супраць палякаў, зь іншага боку мяжы, што парвала край на Захад і Ўсход. Як жа тады непаразуменьні з Адамовічам? Магчыма, гэта былі праявы ўнутранай барацьбы.

## Змова намэнклятуры

Альтэрнатыўная гісторыя Беларусі ў другой палове XX ст. пісалася пад уплывам дзеячаў палітыкі і культуры, якія апынуліся ў эміграцыі. Ясная справа, што тут не магло абысьціся без асабістых рахункаў і ачарніцельства ідэалягічных супернікаў. Хто ж быў чужы для эмігрантаў-нацдэмаў і эмігрантаў-хадэкаў? Вядома ж, сацыялісты і камуністы. У працах гісторыкаў-эмігрантаў яны суб’ектына былі адсунутыя на пэрыфэрыйны плян.

Па-іншаму скажалі ролю нацкамаў у БССР позьнесавецкага пэрыяду, той самы Барыс Сачанка. Дасьледчыкі выстаўлялі «СВБ»

пры¬думкай чэкістаў, а «кіраўнікоў» на чале з Усеваладам Ігнатоўскім — нявіннымі ахвярамі. Бо інакш зусім няможна было б нават заікацца пра супраціў савецкай уладзе або пасьлядоўную працу, скіраваную на падрыхтоўку краіны да поўнай незалежнасьці.

З нашага часу дзейнасьць многіх міністраў беларускага савецкага ўраду ўспрымаецца інакш, як тое напісана ў працах гісторыкаў XX ст.

Нацкамы, відавочна, дамагаліся найперш падтрымкі сельскага насельніцтва — беларускамоўных аўтахтонаў. Яны стваралі беларускую Беларусь.

Нацкамам нельга адмовіць у патрыятызьме і далекасяжнасьці задумаў. Бадай, гэта была адзіная палітычная сіла, якая дамаглася канкрэтных вынікаў у справе будаўніцтва беларускай Беларусі. Тое, што яны пасьпелі зрабіць за лічаныя гады 1920-х, сталася нацыянальным рэсурсам, на якім Беларусь «дацягнула» да канца XX ст.

** 17 лютага 1930 г., арыштваўшы Пятра Ільлючонка, ГПУ пачало справу «Саюзу вызваленьня Беларусі». Усяго па справе «СВБ» вясной—летам 1930 г. арыштавалі 108*

*дзеячаў навукі і культуры. Увесь цьвет беларускай інтэлігенцыі. Кіраўніцтва «СВБ» (Алесь Адамовіч, Антон Баліцкі, Пётар Ільлючонак і Зьміцер Прышчэпаў) атрымала найбольш — 10 гадоў канцлягераў. З большасьцю, 77 чалавекамі, абышліся дастаткова лібэральна: іх выслалі на пяць гадоў у далёкія раёны СССР. Але неўзабаве ўсіх гэтых людзей даб'юць: у 1937—1941 г. справы былі перагледжаны, некаторых расстралялі, частку паслалі на гібель у канцлягеры. У 1949—1952 г. дабраліся да апошніх, хто заставаўся жывы. Іх проста асудзілі на той падставе, што яны былі... асуджаныя раней.*

2005

KAMUNIKAT.org

# Друкарскія таямніцы

Споўнілася 10 гадоў з часу выданьня
“Ксэраксу Беларускага”

У 1997 годзе да мяне пачалі зьвяртацца некаторыя бібліятэкі і асобныя людзі, каб я дапамог ім знайсьці патрэбныя нумары полацкага літаратурнага альманаху “Ксэракс Беларускі”. Да каго ж ім яшчэ было зьвяртацца, як не да выдаўца. Самымі рэдкімі нумарамі аказаліся №1 (1990) і №3 (1992). Я нават мусіў даць абвестку ў “НН”, маўляў, дапамажыце адшукаць выданьне, бо свае архіўныя нумары я не зьбіраўся нікому ахвяраваць. На мой зварот, як ні дзіўна, прыйшлі лісты. Высьветлілася, што пэрыёдык памяталі. Выручыў Алесь Туровіч, які ў сваёй бібліятэцы знайшоў некалькі асобнікаў.

Сёлета “Ксэраксу Беларускаму” споўнілася 10 гадоў. Гэткі маленечкі юбілей праявы беларускай культуры найноўшай гісторыі. Сымбалічна, што першы нумар “КБ” рыхтаваўся ў Полацку, а друкаваўся ў Вільні.

Паспрабуйце згадаць нешта сваё, што мела месца дзесяць гадоў таму. І вы пабачыце, колькі падрабязнасьцяў згубілася з вашай памяці.

Я ўсё ж паспрабую ўзнавіць падрабязнасьці.

На выданьне "КБ" мяне натхніла зьяўленьне ў 1989 годзе альманаху "Літаратура", рэдактарам якога быў Дубавец. Я ведаў, што непасрэдна выданьнем пэрыёдыка займаецца Алесь Гуркоў. З Алесем я ліставаўся з 1988-га, ён раз-пораз дасылаў мне новыя незалежныя друкі, якія пладзіліся тады зь нечаканым імпэтам. Перамовы з Алесем адносна выданьня полацкага літаратурнага альманаху пачаліся яшчэ ў лістападзе 1989 году. Вось вытрымка зь ліста Гуркова ад 3.12.89: "Літаратура" №1 пад рэдакцыяй сп. Дубаўца Сяргея абышлася нам паўтара рубля. Калі падрыхтуеце гэткі альманах, дык паспрабуем яго надрукаваць. Для гэтага трэба падрыхтаваць макет на звычайных друкарскіх аркушох (для машынкі). Потым яны памяншаюцца, і атрымліваецца гэткая кніжачка, як у сп. Дубаўца".

Гэта адносна тагачасных друкарскіх таямніцаў.

Творы для "КБ" №1 я сабраў у наваполацкіх літаратараў. Сяржук Сокалаў-Воюш даў міні-п'есу абсурду "Раніца рэспублікі", Вінцэсь Мудроў зь Цюменскай вобласьці, дзе ён працаваў на нафтавых радовішчах, прыслаў аповед "Час камара", Уладзімер Арлоў, які на

пачатку 90-х зь сям'ёй ужо перабраўся ў Менск, перадаў свой найноўшы "баявік" пра Абэцэдарскага "Совершенно секретно", або Адзін у трох іпастасях (нататкі няўдзячнага вучня)" — "баявік" гэты потым шмат дзе друкаваўся, свае вершы далі Валянціна Аксак і Лявон Баршчэўскі. Памятаю, як зімовым днём я заходзіў па вершы ў малюпасенькую кватэрку Лявона Баршчэўскага, які тады працаваў выкладчыкам замежных моваў у Наваполацкім тэхналягічным інстытуце (цяпер унівэрсытэт). Тэксты твораў начыста перадрукавала Надзея Салодкая. Вокладку намалявала Рыта Цімохава, яна ж намалявала імёны аўтараў перад тэкстамі — кампутараў тады яшчэ не было. Сёньня, калі я параўноўваю "КБ" №1 і "Літаратуру" №1, мне падаецца, што мы не саступалі сталічнаму пэрыёдыку. Вядома, палачане выглядалі больш кансэрватыўна, бо глёбусаўскія здані пачалі распаўзацца па Беларусі менавіта зь першай "Літаратуры", аднак, мушу зазначыць, амаль усё, што было надрукавана ў тым танюткім "Ксэраксе", вытрымала выпрабаваньне часам.

Напрыканцы ліпеня 1990 году першыя асобнікі "КБ" №1 прывёз у Наваполацак зь Менску Сяржук Сокалаў-Воюш. 30 ліпеня на чарговым паседжаньні літаб'яданьня

“Крыніцы” я “абнародаваў” новы пэрыёдык. Трэба прызнацца, навіну сустрэлі раўніва. Было шмат іншых прэтэндэнтаў на рэдактарскую пасаду. Але рэдактара незалежнага пэрыёдыка не прызначаюць, ім становяцца.

“КБ” №1 выйшаў тысячным накладам і распаўсюджваўся зь Менску па розных “нацдэмаўскіх” тусоўках. У Наваполацак патрапіла ня так шмат асобнікаў. Гэткім жа шляхам я падрыхтаваў другі нумар “Ксэраксу” і перадаў яго Гуркову, аднак выдаць яго ў Алеся не атрымалася, таму далейшыя нумары “КБ” друкаваліся ў Наваполацкай друкарні. З “КБ” №2 рэдактарам альманаху стаў Вінцэсь Мудроў, які неўзабаве вярнуўся на радзіму зь сіберных цюменскіх краёў.

“Ксэракс Беларускі” стаў першым полацкім літаратурным пэрыёдыкам XX ст. пасьля трох літальманахаў полацкай філіі “Маладняка”. Зь яго й пачаўся шэраг полацкіх выдавецкіх ініцыятываў, якія потым рэалізоўваліся на працягу ўсіх 90-х гадоў.

2000

## Варона

Гэтая гісторыя зусім і не гісторыя, так сабе, нейкая прыдумка. Бывае, уталопіцца штосьці ў галаву й вярэдзіць, і вярэдзіць, і дробна зумкае. Ня тое, каб замінае жыць. Проста ведаеш - недзе ёсьць, прысутнічае ў нетрах сьвядомасьці. Калі заманіцца - прыслухаесься, дык і пачуеш. А не - дык не. Бо хто гэта будзе адмыслова прыслухоўвацца да розных недарэчных дробязяў?

Карацей, усё гэта глупства. І гісторыя ня вартая асобнага распаведу. Аднак, надарылася мне пазнаёміцца з адным чалавекам. Быў ён мастак і меў такія-сякія амбіцыі. Увогуле, я люблю амбітных людзей. Бо калі ты ня маеш жаданьня зьдзівіць сьвет, дасягнуць вяршыні, дык жыцьцё папросту марнуецца. Ходзіш на працу, зарабляеш на хлеб, нэрвуесься з-за дробязяў, змагаесься за месца пад сонцам - гэткая вавёрчына каруселя. Здаецца, бяжыш некуды, напружваеш цяглiцы, а сам ведаеш выдатна - нікуды ўсё адно не патрапіш. Можна ня бегчы, а паціху нечым займацца, нетаропка, з асалодай, з прыемным хваляваньнем у сярэдзіне - проста дзеля справы, проста каб уцерці ўсім нос. Зробіш, азірнесься, а тыя, што беглі, далёка-далёка ззаду. Безнадзейна адсталі. Змарнавалі толькі час. А ўсё з-за

чаго? Ня мелі амбіцыяў. Яны думалі: вось зараблю на машыну, або стану начальнікам - і буду вялікім чалавекам. Аўто разаб'ецца ў аварыі або заржавее, з пасады звольняць або адправяць на пэнсію - і зноў ні хаты, ні лапаты. А час уже ня вернеш. Таму гэта не амбіцыі, калі нехта хоча стаць начальнікам. Гэта пыха. Вось калі ён імкнецца вынайсьці лекі ад AIDSу або намаляваць геніяльную карціну - гэта амбіцыі. Вызначыць розьніцу між імі нескладана. Сапраўднае застаецца тваім назаўжды. Нават пасьля сьмерці.
Дык вось гэты мастак меў амбіцыі. Ня ведаю, ці меў ён на іх падставы. Бо наўрад ці вы адразу тут і ўзрадаваліся, пачуўшы таямніцу сапраўднага. Не такія вы прастакі. Можна мець вялікія амбіцыі там, дзе нічога табе ня сьвеціць. Гэтак найчасьцей і бывае. Вой як ня проста - мець рэальныя амбіцыі.
Мастака завуць Георг. Родам ён з Арменіі, але гадоў шэсьць жыве ў Менску. Я меў зь ім працяглую гутарку. Відавочна, гэта адукаваны чалавек, ён вольна цытаваў гішпанскую паэзію, слушна разважаў пра эўрапейскі жывапіс і ўсходнюю культуру, бо, як прызнаўся, належыць да руху прыхільнікаў філязофіі ёгі. Апошняе, мне падаецца, і сфармавала яго як асобу. Георг доўга разважаў пра лёс і наканаванасьць. Маўляў, і тое, што жыве зараз у Менску, і тое, што

апынуўся ў Полацку - наканаваньне. Гэта зусім ня значыць, што іншага не магло быць, проста дзеля ягонага духовага разьвіцьця тое патрэбнае.
Прызнаюся, Георг - сымпатычны мне чалавек, і я зь цікавасьцю яго слухаў. Аднак у нейкую хвіліну мне ўзгадалася варона, якую колькі тыдняў таму бачыў са свайго вакна. Птушка павольна ляцела ля самага майго пятага паверху, зусім побач, і я пасьпеў яе добра разглядзець. Пёры на крылах, вока, якое не выдавала ніякіх эмоцыяў, падкурчаныя лапкі, графічнасьць дзюбы. Узгадаў, і птушка не выходзіла з маёй галавы. Тады, калі я яе ўбачыў, мне падумалася: вось ляціць некуды й ведае куды, бо, відавочна, ня проста так кружляе. У чым палягае матывацыя яе палёту? Бязглуздае пытаньне, але яно засела ў маёй галаве, і я некалькі разоў вяртаўся да гэтай гісторыі, спрабуючы прааналізаваць усе прычыны й вынікі гэтага. Я разважаў пра пошукі ежы, будаўнічага матар'ялу для гнязда... Але нечакана мне падумалася зусім аб іншым. Што здарылася б із сусьветам, калі б кожная варона страціла разуменьне таго, куды і навошта трэба ляцець?
Я слухаў Георга, а перад вачыма стаяла тая варона, якая, нясьпешна махаючы крыламі, упарта ляцела да нейкай, невядомай мне

мэты. Ці кіравала ёю ў гэтым палёце наканаваньне? Па вялікім рахунку - так. Бо жыцьцё патрабуе выкананьня запраграмаваных прыродай адпаведных дзеяньняў - сну, харчаваньня, клопату пра патомства. Але варона ляцела менавіта ў тым накірунку, менавіта ў той час, менавіта з той хуткасьцю, менавіта на той вышыні...
Я й дасюль не разьвітаўся з пытаньнем пра варону. Прайшло столькі часу, а яно ўсё не дае мне спакою.

*2000*

## Крыж Эўфрасіньні Полацкай

Надвор'е выдалася паганым. Тры дні запар ішоў мярзотны, халодны дождж. Тры дні сьвінцовае аблогі. Ніштo так не выстуджвае ўвосень і двор, і жытло, як гэткае безнадзейнае занудзтва. І трэба ж было ўпільнаваць дрэнь-надвор'е для сьвята. Зь дзяцінства памятаю, як усяк казалі пра жыдоўскі або каталіцкі Вялікдзень. Усё больш сумотная непагадзь. Затое наш Вялікдзень быў заўжды сонечны, па-веснавому ўрачысты. Гэтая відавочная перавага заўжды ўзгадвалася ў перадсьвяточных гутарках дарослых. Любіла яе і моладзь. Ня зь нейкіх ідэалягічна-канфэсійных меркаваньняў, хутчэй з жыцьцёва-практычных. Сьвяткаваць Хрыстова ўваскрашэньне можна было на прыродзе, без нагляду дарослага вока. Традыцыйна «хрыстос уваскрос» імкнуліся «прамовіць» так, каб узгадваць затым цэлы год. Да наступнага Вялікадня.

Горад загадзя рыхтавалі да сьвята. Нават пад дажджом уздоўж шляху да сьвятыні фарбавалі фасады дамоў. Усё гэта выглядала камічна і трагічна адначасова. Далібог, камічна глядзець на працэс фарбаваньня пад дажджом. Бедныя маляры, мокрыя і выпэцканыя ў фарбу дарэшты,

бесьперапынна чулі спагадлівыя кпіны і жарты мінакоў. Падобны гумар узьнікае самаадвольна. Як ад экранных блазнаваньняў Чарлі Чапліна. На самой справе нібыта і грэх сьмяяцца, калі б'юць некага палкай, ці — банальна — кулаком па твары. Але сьмяесься. У той самы час справа, якая робіцца марна, заўсёды трагічная. Трагізм яе ня толькі ў бязмэтнасьці, колькі ў фатальнай наканаванасьці. Як сьмерць. Усе разумеюць — і той, хто аддаў загад, і той, хто яго выконвае, што фарбаваць пад дажджом — тое самае, што карміць некага намаляванымі на паперы стравамі. І ўсё адно фарбуюць. Наканаванасьць. Так трэба. Бо на сьвята мусіць прыехаць прэзыдэнт. «Э-э-э, — скажа ён бацькам гораду, калі пабачыць наўкол занядбанасьць і нерупілівасьць, — пэўна, вы нядбайныя кіраўнікі, бо спраўны гаспадар заўжды прыбярэ ў хаце да госьця». Вядома, прыбраць трэба. Вось толькі з надвор'ем не пашанцавала.

Мы ідзем па вуліцы Эўфрасіньні Полацкай. Яшчэ мяккі асфальт пакідае на сваім целе адбіткі нашых падэшваў. Васіль Кроква — зацяты, аскетычны дзяцюк, якога ведаю зь дзяцінства і даўно прызвычаіўся да ягонага хлапечага максымалізму. Тамаш Гурба — разважлівы і цярплівы да чужой думкі. Ня

любіць спрачацца. Часам непасьлядоўны ў сваіх перакананьнях. Аднак заўсёды мае рэальную мэту наперадзе. І вельмі часта яе дасягае. Мае сябры жывуць у іншых гарадох. Яны прыехалі на сьвята. Яшчэ ўчора ўвечары мы сабраліся разам за маім круглым кухонным сталом. Гутарылі да змружаных павекаў. Кроква, як зазвычай, усё граміў і пляжыў. «Гэта прафанацыя — рабіць дублікат Крыжа Эўфрасіньні. Па-першае, такія рэчы ня робяцца партыямі, па-другое — не Філарэту яго асьвячаць». Ён запаляўся і апантана трос відэлец з лусьцікам каўбасы перад маім носам. «Немагчыма другі раз намаляваць Джаконду. А тут табе не Джаконда — гэты Крыж — наш лёс і сымбаль, мільёны і мільёны нашых продкаў намольвалі яго, гэта крыніца духовай сілы, яго немажліва прадубляваць». Кроква нібыта «разносіў» мяне за тое, што я даў дазвол на выраб копіі сьвятыні. «Чаго ты сюды прыехаў?» — не стрываў Тамаш. Дзіўна, але Гурба ўлез у спрэчку. Хлопец, напэўна, хацеў спаць — нясьцерпнае жаданьне прытупіла ягоную пільнасьць. «А каб быць сьведкам прафанацыі веку. Аднойчы езуіты вырабілі копію. Вядома, зь якой мэтай. Копія — заўжды падман». Кроква мяне таксама стаміў. «Ніхто не зьбіраецца гэты крыж уважаць за сапраўдны, — Васіль умеў запаляць суразмоўцу, таму я

адказваў яму з адпаведным запалам і тэмпэрамэнтам. — Аднак, дзядзька, уяві, што большасьць нашых людзей, гэтак званых беларусаў, ніколі ня чулі, што быў такі Крыж, які на загад Эўфрасіньні Полацкай зрабіў Лазар Богша і які лічыцца нацыянальнай сьвятыняй. Яны ня чулі пра ягоны лёс, што Крыж зьнік падчас Другой сусьветнай вайны і што яго марна шукаюць па сёньняшні дзень. Уявіў? Цяпер уяві, што вырабляючы дублікат, безьліч людзей былі задзейнічаныя ў справу, у тым ліку вышэйшых герархаў зь Ерусаліму, да якіх мітрапаліт зьвяртаўся па дапамогу. Сама па сабе гэта была гучная культурніцкая акцыя. Была нагода пісаць пра Крыж скрозь і шматкроць. Выйшлі кнігі пра сьвятыню. Гэта была нацыянальная інфармацыйная кампанія. Бо згадзіся, калі прынцэса Дыяна пачала змагацца за забарону проціпяхотных мінаў, шмат у каго зьявілася пачуцьцё кан'юнктуры і таннага тэатру. Трэба проста разумець, зь якой мэтай нешта робіцца і якія вынікі можна гэтым дасягнуць». Мае словы яшчэ больш распалілі Крокву. Ён пачаў казаць пра падставовыя рэчы, праз якія нельга пераступаць, маўляў, мусіць жа быць нешта сьвятое, што нельга выкарыстоўваць ні ў якіх кампаніях — ні ў гандлёвых, ні ў палітычных, ні ў інфармацыйных, нягледзячы на самыя высакародныя мэты і задачы.

Камусьці звонку магло падацца, што назаўтра пасьля такой гутаркі ўчорашнія сябры не павітаюцца. Ён памыліўся б.

Яшчэ ўчора я ведаў, што ніякага прэзыдэнта на сьвяце ня будзе. Больш за тое, амаль увесь папярэдні сцэнар: вынас Крыжа з Сафійскага сабору, урачыстае шэсьце ад Сафійкі да Спаса-Эўфрасіньнеўскага манастыра — адмянілі. Гэтыя навіны ўдала працавалі на млын Кроквы. Васіль кпіў са «спрыяльнага» надвор'я, са спрашчэньня сьвята, зь пераменлівых рэлігійных пачуцьцяў прэзыдэнта, з эфэктыўнасьці інфармацыйнай кампаніі і г.д. і г.д. Актуальнасьць сьвята для краіны мы пачалі ўсведамляць па дарозе. Лічаныя людзі ішлі ў нашым кірунку. Падыходзячы да брамы манастыра, я налічыў усяго некалькі міжгародніх «Ікарусаў». Дождж з самай раніцы не пераставаў церусіць. На манастырскім пляцы пад парасонамі тоўпіліся паломнікі. Было іх, як зазвычай на Вялікдзень, калі зьбіраюцца толькі палачане. На ганку дому, у якім жывуць манашкі, пад бляшаным брыльком хаваліся ад дажджу журналісты. Ніякай сьвяточнасьці і прыўзьнятасьці на тварах у людзей не было. Наадварот, ва ўсім прачытвалася шчырая журба, нават больш — будзённасьць нейкага звыклага мерапрыемства. Урачыстае

набажэнства, якое павінна было адбыцца ў Крыжа-Ўзьвіжанскім саборы, затрымлівалася. Знаёмыя журналісты паведамілі, што ўладыка чакае гасьцей — прэм’ер-міністра са сьвітай, апошнія спазьняюцца ўжо на гадзіну. Раптам над манастыром пачуўся голас «едуць, едуць!» (ці не са званіцы) і сам мітрапаліт у коле япіскапаў рушыў да брамы сустракаць гасьцей. Манашкі, якія сшыхтаваліся шнуром, па-савецку ўручылі старшыні ўраду хлеб-соль. Мітрапаліт і прэм’ер абняліся і пацалаваліся. Хаўрусным натоўпам госьці і гаспадары зьніклі за дзьвярыма храма. Усьлед павалілі шараговыя вернікі. Усчалася штурханіна. Гурба спрытна ўшрубаваўся ў чалавечую плынь. Нейкі час я бачыў ягоную каротка абстрыжаную патыліцу, якая ўдала прасунулася ў сярэдзіну царквы. Кроква адмовіўся штурхацца і застаўся на вуліцы, традыцыйна-зьедліва пракамэнтаваўшы падзею — «як у краму, гэтак жа і ў храм боскі». Я вырашыў пачакаць —няхай большасьць зойдзе, пэўна ж мне, худому акулярніку, усё ж застанецца які пятачок. Актыўна шчаміцца было прыкра. Хвілін праз пятнаццаць я ўвайшоў у сабор. Спрабуючы не штурхацца, на дыбачках прасунуўся крокаў на дванаццаць ад уваходу. Праўда, нягледзячы на ўсе перасьцярогі, мяне некалькі разоў аблаялі, а адзін раз дык па-

мацернаму. Маўляў, шчаміцца трэба, калі шчэмяцца ўсе, а зараз куды прэсься. У царкве ўжо было задушна. Мокры натоўп пачаў выпарацца. Задуха і вільгаць наганялі млосьць. Бабулі, якая стаяла крокаў за дзесяць наперадзе, стала кепска, яе падхапілі пад рукі і пачалі выцягваць вонкі. Голас Філарэта далятаў да майго кута невыразна, і я чуў, бадай, адно манатонны гуд, у які зьліваліся словы набажэнства. Яшчэ хвілін праз дваццаць здаравенная цётка, як два мяне, з бульдозэрным імпэтам пачала ламіцца да выхаду. (Адна мая знаёмая сказала б: як лось па кукурузе.) Людзі абураліся, але яна голасна верашчала, што ў яе аўтобус на Докшыцы праз паўгадзіны, і з-за іх, абуральнікаў, яна можа спазьніцца. Я скіраваўся ў цётчын фарватар і апынуўся на сьвежым паветры. Побач з уваходам у царкву ляжала бабуля, якую на маіх вачах выцягнулі з сабору. «Хуткая» яшчэ не прыехала. Я падышоў да Кроквы. Ён стаяў пасярод манастырнага пляца і тупа глядзеў на старую кабету, што ляжала на лаўцы. «Вось і першыя ахвяры падману», — адно, што сказаў сябар. Хвілін дзесяць мы маўчалі. «Дзе гэты Гурба? Трэба ўжо зьбірацца», — відавочна нэрвуючыся, вымавіў я, нібы сам сабе. Гурба быў усярэдзіне, і нават калі бы мы яму перадалі ўрадавую тэлеграму, каб выбіраўся,

ён усё адно ня здолеў бы гэтага зрабіць. Прыйшлося чакаць канца набажэнства. «Хуткая» доўга не прыяжджала. Бабулі на сьвежым паветры стала лягчэй, але ўзьняцца ў яе не было сілаў. Яна адзінока ляжала на вузкай мулкай лаўцы і пакутнымі вачыма глядзела ў мокрае, шэрае неба. Неўзабаве прыйшла лекарка ў белым халаце. Яна штосьці ўкалола кабеце і нетаропка пайшла да машыны, клікаць санітараў, каб тыя забралі хворую. Тыя, гэтак жа нетаропка, прыйшлі, уклалі небараку на насілкі і панесьлі. Дождж скончыўся. Але ўсё адно было золка. Сьцюдзёны вецер дакранаўся да цела халоднымі рукамі.

Яшчэ хвілінаў дваццаць чакалі Гурбу ўжо пасьля сканчэньня набажэнства. Людзі па чарзе пачалі цалаваць Крыж і атрымоўваць на памяць паштоўку зь ягонай выяваю. Вядома, Гурба ня мог сысьці без выкананьня поўнай праграмы.

Вярталіся моўчкі. Па дарозе сустрэлі дзьвюх бабуляў. Адна ішла ў манастыр, другая — з манастыра. «Ну тык ці ёсьць тамака Лукашэнка?» — спытала ў знаёмай тая, што ішла да манастыра. «Нямашака. Ня бачыла», — скрушна адказала бабця, якая вярталася дахаты. На добрай хуткасьці іх абмінуў

«Ікарус», поўны нейкіх чыноўнікаў у гарнітурах і гальштуках, аўтобус скіраваўся да манастыра. «Вунь, пэўна ж там паехаў... Лукашэнка», — выказала здагадку тая, што спазьнілася. Абедзьве бабулькі старэчымі крокамі, трымаючы адна адну, пасунулі ўсьлед за аўтобусам.

1998

KAMUNIKAT.org

## Дзе пахаваны наш першы сьвяты

Торвальд Вандроўнік быў першым хрысьціянскім місіянэрам у Беларусі. Магчыма, гэта ён адпяваў Рагнеду і Ізяслава. «Там ён пахаваны ў адной гары каля Полацку, і называюць палачане яго сьвятым», — пішуць сагі. Магіла сьвятога — у Полацку на Востраве?

Прачынаюся. Нават з заплюшчанымі вачыма адчуваецца, што раніца лагодная. Узыход ліпеньскага сонца ў такія хвіліны можна нават пачуць — асабліва ў зацішным кутку ў драўляным прыватным доме. Калясьніца Ярылы на крутым пад’ёме нябеснага шляху грукоча як мае быць. Прыслухаесься і выразна чуеш адмысловы гуд — гэтак жа дае аб сабе знаць далёкая аўтастрада.

Устаю з ложка і іду да акна. З другога паверху можна гадзінамі глядзець на прыдзьвінскі краявід. Паверхня магутнай ракі гладкая, і ты проста фізычна адчуваеш тую волатаўскую моц, зь якой яна коціць у Балтыку свае воды. У ёй адбіваецца глыбокі блакіт неба, цені кірляў, якія нястомна кружляюць у насычаным сонечнымі прамянямі паветры, і дрэвы закінутага парку на супрацьлеглым беразе. Адтуль у мой сад прылятаюць уначы совы.

На старажытных мапах Полацку супрацьлеглы бераг пазначаўся як Востраў. Тут у даўнія часы знаходзіўся манастыр Іаана Прадцечы (Хрысьціцеля). Водны рукаў, што агінаў Востраў з паўднёвага боку, колькі стагодзьдзяў таму занесла пяском. Абарончае значэньне прыроднай фартыфікацыйнай перашкоды зьнікла яшчэ ў сярэднявеччы, ніхто і не падтрымліваў яе ў спраўным стане. Вядомы археоляг Сяргей Тарасаў, аўтар кнігі «Полацак IX—XVII. Гісторыя і тапаграфія», сцьвярджае, што Востраў па-ранейшаму застаецца самай маладасьледаванай археолягамі тэрыторыяй гораду.

Раным-рана тысячу гадоў таму на супрацьлеглым беразе ракі прачынаўся легендарны Торвальд Вандроўнік. Ён любаваўся тымі ж краявідамі — хуткабежнымі водамі Дзьвіны, нястомнымі кірлямі над ракой, блакітам неба. Торвальд быў стары і мудры. Ён вырашыў застацца тут і адысьці ў лепшы сьвет менавіта тут, на Полаччыне. Ён палюбіў гэтых людзей, якім прынёс веды пра сьвет і хрысьціянскую веру, расповеды пра міласьцівага Госпада і таямніцы сьвету.

Ісьляндзкі місіянэр бачыў безьліч розных краявідаў — роднае ісьляндзкае акіянічнае

ўзьбярэжжа, фіёрды Скандынаўскай паўвыспы, Ерусалім і Канстантынопаль, стэпы Падняпроўя. Але абраў Полацак.

Старажытная скандынаўская «Сага пра Хрост» апавядае: «Торвальд памёр у Русі непадалёка ад Палтэск'і (Полацку). Там ён пахаваны ў адной гары ў царкве Яна Хрысьціцеля, і называюць палачане яго сьвятым».

Торвальд — наш першы сьвяты? Супольны, да падзелу на праваслаўных і каталікоў.

Месца пахаваньня Торвальда Вандроўніка застаецца загадкай для гісторыкаў.

Некаторыя гісторыкі трымаюцца вэрсіі, што Торвальд жыў і быў пахаваны ля ракі Друя (Дроўны): так напісана ў скандынаўскай сазе. Але цяжка ўявіць, каб у тыя даўнія часы хрысьціянскі місіянэр мог пасяліцца, ды яшчэ збудаваць царкву, у такіх паганскіх нетрах. Торвальд мог весьці місіянэрскую дзейнасьць на Падзьвіньні толькі з дазволу полацкага князя Ізяслава і пад яго асабістай апекай. Магчыма, Ізяслаў з Рагнедай, каб распачаць хрысьціянізацыю Полацкага краю, зьвярнуліся да бізантыйскага імпэратара па дапамогу, а той і паслаў у Полацак Торвальда

або некалькі місіянэраў на чале з Торвальдам, якія заснавалі ў крыўскай сталіцы манастыр.

Лепшага месца, чым Востраў, для пасяленьня Торвальда ў ваколіцах Полацку няма. Сяліць хрысьціянскага місіянэра нават на Гарадзішчы, побач з княжацкімі палатамі, было небясьпечна. Усё магло здарыцца — не дапільнуесься. А вось на Востраве, пры невялікай ахове, можна было больш-менш спакойна жыць і будаваць манастыр. Побач з манастыром, магчыма, і быў пахаваны адзін зь першых сьвятых нашай зямлі — Торвальд Вандроўнік. Калі нават ад яго магільнага кургану не засталося і знаку, дык усё адно парэшткі Торвальда ляжаць у зямлі Вострава. Там і трэба будаваць капліцу-пахавальню. Засталося толькі знайсьці месца, дзе стаяў манастыр Іаана Прадцечы. Кажуць, месца пахаваньня сьвятога часам можа зьзяць...

Пайшлі з жыцьця гэтыя нekананізаваныя — пакуль — сьвятыя беларускай зямлі амаль адначасова: Рагнеда — у 1000 годзе, Ізяслаў — у 1001, Торвальд — у 1002. Напэўна, Торвальд адпяваў Рагнеду і Ізяслава. І ці не пахаваны Торвальд і Ізяслаў побач?

2005

## Паўгоду ў скуры віленчука

Я некалькі разоў у сваім жыцьці быў не ў сваёй скуры. Аднойчы — нават у скуры дыктатара невялікай афрыканскай краіны. А здарылася гэта так.

Быў 1988 год. У Заслаўі менскія талакоўцы ладзілі агульнабеларускае купальле. Згодна з усімі правіламі, традыцыямі і запаветамі. Зразумела, на такім мерапрыемстве мусілі быць усе нацыянальныя героі і правадыры: пачынаючы з Пазьняка, Арлова, Марачкіна і канчаючы Вячоркам, Івашкевічам, Вітушкам ды Сысом. Ня мог прамінуць такой падзеі і новапалачанін Сяржук Сокалаў-Воюш. З Наваполацку ў Заслаўе прыкаціў "Ікарус", сярод пасажыраў якога былі і я з жонкай.

Невялікі аматар фальклёрных ігрышчаў, я бязмэтна аціраўся ў беларускамоўным натоўпе. Тут было багата маладых літаратараў з "Тутэйшых", і я час ад часу спыняўся, сустрэўшы чарговага паплечніка зь літсуполкі. Пасьля кожнай размовы я набрыньваў сталічнымі навінамі. Мая жонка, выхаванка сталічнага парнату, бавіла час з сваімі аднакашнікамі, якія і ўтваралі касьцяк тагачаснай менскай "Талакі". Начаваць у ваколіцах Заслаўя мне, па шчырасьці, зусім

не жадалася. Пагатоў, мая Тацяна была цяжарная.

Высьветлілася, што дахаты неўзабаве мусілі вяртацца Арлоў з Пазьняком. Мая просьба прагучала амаль як зварот аб паратунку. Арлоў патлумачыў: вольнае месца ў машыне толькі адно, маўляў, Тацяну могуць забраць, але мяне — не. І тут нечакана Пазьняк камандным голасам заявіў: “Бярэм дваіх, ён (Зянон кіўком галавы паказаў на мяне) паедзе ў багажным аддзеле”. Дагэтуль я ніколі ня езьдзіў у аўтамабільным багажніку, але ўзрадаваўся неверагодна.

Шостым пасажырам “Нівы” скульптара Алеся Шатэрніка быў мастак Алесь Марачкін. Я здолеў уціснуцца ззаду ў багажны аддзел. Па дарозе да Менску Пазьняк кінуў мне: “Ты ў нас як дыктатар невялікай афрыканскай краіны, якога таемна вывозяць за мяжу”. За мяжу ў 96-м давялося таемна зьехаць самому Зянону Станіслававічу. А я да сёньня шчыра ўдзячны яму за незвычайны падвоз.

У Вільні ж у 2001 годзе я апынуўся ў скуры сьпікера беларускага парлямэнту на выгнаньні. Няхай сабе й часткова. Мяркуйце самі.

Улетку таго году Сяргей Дубавец запрасіў мяне ў крывіцкую Мэкку папрацаваць на “Балтыйскіх хвалях”. Нічога пільнага мяне ў Полацку не трымала, і я пагадзіўся. Прыехаў разам з Тацянай і пачаў шукаць часовае жытло. На першыя дні нас прытуліў калега з “хваляў” Сяргей Харэўскі. Пасьля марных самастойных пошукаў я зьвярнуўся па дапамогу да свайго старога знаёмага, Алега Мінкіна. А ён і кажа: ёсьць тут адна кватэрка ў Фабіёнішках — тры пакоі, усе выгоды, у ёй Шарэцкі зь сям’ёю жыў. Якраз напярэдадні майго прыезду ў Вільню Сямён Шарэцкі, былы старшыня Вярхоўнага Савету XIII скліканьня, пакінуў Літву, перабраўшыся ў Штаты. Паехалі глядзець. Гаспадыня кватэры Тэрэза, прыязная беларуска з Астравеччыны, з прыемнасьцю пагадзілася здаць яе новаму кватаранту. “Тут спаў ахоўнік, — паказала яна на канапу, якая неяк нязвыкла стаяла ў невялікім калідорчыку ля ўваходных дзьвярэй. — Вы ўжо прабачце, не было каму прыбраць. Калі не замінае, дык няхай і застаецца”. — “Няхай застаецца”, — пагадзіўся я.

У нас любяць мянціць языкамі пра беларускую страту тысячагодзьдзя — Крывіч-гораду. І прыплятаць сюды Гедыміна, Барбару Радзівіл, Івана ды Антона

Луцкевічаў, “Нашу Ніву” зь “Вянком” Багдановіча... Згодны, гэты горад моцна зьнітаваны з шматлікімі культурнымі дасягненьнямі беларусаў. Але ўсё гэта ў мінулым.

Інтэлектуальна кволы й колькасна малалікі беларускі рух на пачатку XX стагодзьдзя ня мог стаць у Вільні ўплывовым. Мяне заўсёды бянтэжыла, калі я чытаў у мэмуарах дзеячоў беларускага адраджэньня часоў Луцкевічаў—Ластоўскага, як у іх апісвалася знаёмства ў Вільні зь іншымі беларусамі: як прыгода, як нешта нечуванае. Трэба было пажыць багата часу ў гэтым невялікім горадзе, каб аднойчы выпадкова натрапіць на гэтых таемных “гаспадароў” места... Шчыра прызнаемся, беларуская прысутнасьць у Вільні была мізэрнай. А тое, што на тамтэйшых кірмашох скрозь гучала беларуская мова... дык у Бешанковічах гучыць да сёньня. Вось толькі дзе там тая беларушчына?

Затое ў сёньняшняй Вільні, як і сто гадоў таму, паўсюль чуваць польская мова — у транспарце, на вуліцы, у крамах, зь дзіцячых вуснаў. Віленскія палякі маюць дзясяткі польскамоўных школаў і садкоў. Вельмі часта ў віленскіх крамах, пачуўшы ад кліента беларускія словы, гандляркі адказваюць па-

польску. А прыканцы 90-х у Вільні зьявіўся шыкоўны цэнтар польскай культуры, на будаўніцтва якога Польшча выдаткавала некалькі мільёнаў даляраў. У горадзе ёсьць польская мастацкая галерэя, FM-станцыя, выходзяць польскія газэты і нават літаратурны часопіс. Беларусам Літвы нават марыць не выпадае пра такія рэчы.

Прыемна пашпацыраваць па Вільні зь Сяргеем Харэўскім, які ведае ў старым месьце кожны дом і можа распавесьці сотні гісторыяў пра яго. Тут месьцілася рэдакцыя "Нашай Нівы", у гэтай вязьніцы сядзеў Каліноўскі, у гэтым доме выдаваў свае кнігі Францішак Скарына, тут жыў зь сям'ёй Вацлаў Ластоўскі, тут месьціўся беларускі музэй, а ў гэтым храме за часамі фашыстоўскай акупацыі перахоўваліся найбольш каштоўныя экспанаты музэю... Пасьля сьмерці Лявона Луцкевіча Харэўскі, бадай, самы дасьведчаны ў гэтай справе.

Упершыню Вільню я наведаў у 1986 годзе, калі вучыўся на перадапошнім курсе наргасу. У сваю "камэрцыйную" вандроўку мяне ўзялі дзяўчаты-аднакурсьніцы. У віленскіх кавярнях я па-беларуску замаўляў для ўсіх сьняданак, і гэта гарантавала прыязнае абслугоўваньне. Цяпер капіталізм згладзіў (або

глыбока схаваў) нелюбоў літоўцаў да ўсяго расейскага. Можаце замаўляць стравы нават на тамбоўскай фені — абслугоўваньне будзе выдатнае. Час ад часу па цяперашняй Вільні езьдзіць адмысловы турыстычны аўтобус бяз даху, які любяць фрахтаваць кампаніі вясёлых рабятаў з РФ — блатныя песьні далёка разносяцца над Вяльлёй.

Этнічныя славяне (беларусы-расейцы-украінцы) ды самі літоўцы зь нізкіх сацыяльных слаёў любяць Беларусь і добра адгукаюцца аб Лукашэнку. Аднойчы пачуў ад таксіста-славяніна крык душы: “Гары яна гарам, такая свабода!” Я яму тлумачу “перавагі” нашага жыцьця, а ён слухаць ня хоча, пытаецца: “У вас працуюць заводы?” — “Працуюць”, — адказваю. “Ну дык памаўчыце, у нас нават дворнікам немагчыма ўладкавацца, а ўсё гэтае, што навокал, стракатае-бліскучае — шкляныя пацеркі для абарыгенаў”.

Памятаю грандыёзную па колькасьці ўдзельнікаў акцыю перапахаваньня парэшткаў Івана Луцкевіча на віленскіх могілках Роса ў 1991 годзе. Сёньня ж на Літарацкай горцы, дзе пахаваныя браты Луцкевічы, Францішак Аляхновіч, Казімер Сваяк, Лявон Вітан-Дубейкаўскі і інш., пануе

занядбаньне. Добра дагледжана толькі супольная магіла Луцкевічаў (сочаць сваякі). Надмагільны помнік Аляхновіча нахіліўся, як Пізанская вежа, фарба на ім аблупілася (прынамсі, я такім яго пабачыў увосень 2001 году). На Дзяды нікога зь беларусаў на Літарацкай горцы я не сустрэў. Праўда, колькі сьвечак усё ж знайшоў на сьціплых капцах. Але ці параўнаеш гэта з тым вялікім полымем, якое шугала над гранітнай плітой, пад якой пахаваныя маці і сэрца Пілсудзкага?

На тле відавочнага згасаньня беларускага руху ў Вільні ў 2001 годзе тут усё ж адбылася адна значная, можна сказаць, гістарычная падзея. Дубавец і Харэўскі дакладна высьветлілі месца пахаваньня Кастуся Каліноўскага. Ка́ты разумелі, што магіла "бунтаўніка" абавязкова з часам ператворыцца ў аб'ект паломніцтва, таму цела нескаронага Кастуся разам зь некалькімі закатаванымі польскім паўстанцамі таемна зарылі ў зямлю на тэрыторыі расейскага вайсковага гарнізону на Замкавай гары. Так-так, парэшткі Каліноўскага ляжаць каля вежы, якая прысутнічае на кожнай другой віленскай паштоўцы. За палякамі на месцы пахаваньня нават стаяў памятны-крыж аўтарства скульптара Антона Вівульскага (у Вільні ёсьць вуліца ягонага імя). Літоўцам

беларус Каліноўскі на такім стратэгічным месцы, якое зьяўляецца сымбалем Вільні і дамінуе над усім горадам, быў не патрэбны. Магіла зарасла дзёрнам. Тацяна Сапач паказала сюжэт пра адкрыцьцё месца пахаваньня Каліноўскага на дзяржаўным канале LRT. Вянок на магілу героя нёс я. Празь нейкі час у адной зь віленскіх кавярняў кельнэрка мне кажа: “А я вас вчера видела по телевизору”. “А пра што была перадача?” — спытаў я, нібыта здымаюся на тэлебачаньні штодзень і мне цяжка згадаць учарашнюю праграму. “А вы там с цветами ходили по Замковой горе”.

У царкве сьв. Мікалая, дзе штотыдзень у суботу адбывалася служба па-беларуску, зьбіралася ня больш за 10–15 чалавек. Заўсёднікамі на ёй былі Тацяна Сапач і Сяргей Вітушка. Зрэдку тут можна было сустрэць Алега Мінкіна ці Зьмітра Бартосіка. Сёньня беларускія службы перапыніліся. Няма паствы.

Пра Вільню ў Полацку мне штодзень нагадвае мой партрэт, які напісаў вядомы мастак Алесь Поклад. Ягоны сын Янка, нашчадак па матчынай лініі славутых Луцкевічаў, разам з бацькамі сустракаў са мной Каляды 2001 году ў кватэры Шарэцкага. Ён любіць гуляцца ў

машынкі і марыць стаць гоншчыкам “Формулы–1”.

жнівень, 2003

**Зьмест**

**Маё Жодзіна**
**Гэсэ, вярблюды і войска**
**Вяртаньне ў "Тутэйшыя"**
**Аскепкі вялікага малюнку**
**Полацак жывы літаратурай**
**Рызыкоўная барацьба намэнклятуры**
**Друкарскія таямніцы**
**Варона**
**Крыж Эўфрасіньні Полацкай**
**Дзе пахаваны наш першы сьвяты**
**Паўгоду ў скуры віленчука**